Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 13 (3919)
ПЯТНІЦА, 16 СТУДЗЕНЯ
1931 г.

Цана нумару 5 кап.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

Сустрэчная хваля сацыялістычнага наступленьня

Зьніжэньне вытворчасьці, якое пранягваецца са ўсё ўзрастаючай сілай ў капіталістычных краінах, падзешаўленьне аграрных прадуктаў, рассоўваньне «ножніц» паміж аграрнымі і прамысловымі цэнамі, памяншэньне ёмкасьці ўнутраных рынкаў, узрастаючае беспрацоўе,—гэтыя фактары, з аднаго боку, паглыбляюць супярэчнасьці паміж асобнымі капіталістычнымі дзяржавамі, у першую чаргу паміж капіталістычным сьветам і СССР, і з другога боку—выклікаюць розкія клясавыя канфлікты ўнутры гэтых дзяржаў. Капіталісты імкнуцца пры дапамозе скарачэньня зарплаты, павялічэньня рабочага дня, драпежніцкай капіталістычнай рацыяналізацыі і рабаваньня сацыяльных страхаваньняў узьняць сваю канкурэнта - здольнасьць і, такім чынам, пераляжыць увесь цяжар крызісу на плечы рабочае клясы. Наступленьне капіталістаў на рабочую клясу ідзе на ўсім міжнародным капіталістычным фронце. Рабочыя пад кіраўніцтвам кампартыі ўсюды аказваюць жорсткае супраціўленьне наступленьню капіталу. **Месцамі рабочая кляса пераходзіць ад абароны да нападу. Гэтым іменна характарызуецца барацьба рурскіх вуглякопаў.**

Забастоўка рурскіх вуглякопаў мае вялізарнае палітычнае значэньне, якое перасягае далёка за межы аднаго гэраічнага эпізоду клясавае барацьбы пралетарыяту. У першы раз за апошнія гады ў Нямеччыне мы былі сьведкамі вялікай стачачнай барацьбы, арганізаванай яшчэ **перад сканчэньнем абавязваючай калумовы.** Асабліва трэба падкрэсьліць, што гэта пераломная стачачная барацьба мела месца ў час жорсткага эканамічнага крызісу, калі лік беспрацоўных перавышае катастрафічную цыфру чатырох мілёнаў. Правыя апартуністы, рэнэгаты-брандлераўцы і сацыял-дэмакраты заўсёды падкрэсьлівалі поўную немагчымасьць эканамічных баёў у такі час. Вуглякопы Руру, пад кіраўніцтвам кампартыі, разьбілі гэту контр-рэвалюцыйную тэорыю і ня толькі прыступілі да барацьбы, але-ж адразу надалі ёй **наступальны** характар.

Рэвалюцыйная прафпазыцыя кіравала барацьбой вуглякопаў, выставіўшы тры асноўных патрабаваньні: 1) безадкладная адмена скарачэньня рабочых, 2) ні гроша скарачэньня зарплаты, ніякіх нагоршаньняў умоў працы і 3) увядзеньне 7-гадз. працоўнага дня.

Ня гледзячы на эканамічны характар патрабаваньняў вуглякопаў, стачка адразу-ж перарасла ў палітычную барацьбу. З першага-ж дня стачкі вуглякопы сустрэліся з адзіным лягерам ураду, капіталістаў, сацыял-фашыстаў і прафсаюзнай бюракратыі, якія абвясьцілі забастоўку па-за законам.

Рурскі басэйн быў заліты войскам Рэйхсвэра. Пачаліся ўсюды масавыя арышты. Паліцыя, сумесна з дружынамі фашыстаў і сацыял-фашыстаў, нападала на стачачныя пікеты. Адбываліся бязьлітасныя сутычкі. Капіталісты прабавалі замяніць бастуючых беспрацоўнымі вуглякопамі, але, ня гледзячы на ўсе намаганьні, ня было амаль ніводнага выпадку штрэйкбрэхерства. У гэтай гэраічнай салідарнасьці галадуючых беспрацоўных і бастуючых вуглякопаў знайшла свой адбітак вастрыня, бязьлітасьць і багатаўпасьць нямецкага пралетарыяту, у ёй-жа заключаецца залог надыходзячых перамог.

Тое, што не ўдалося зрабіць капіталістам пры дапамозе рэйхсвэра, паліцыі і штрэйкбрэхераў—зрабіла прафсаюзная бюракратыя і сацыял-дэмакраты. Прафсаюзны апарат змог навязаць сваю здрадніцкую волю вуглякопам. Стачка часова спынілася. Але ў сувязі са штрэйкбрэхерствам рэфармісцкага прафсаюзу вуглякопаў пачалося моцнае хваляваньне ў нізох са сацыял-дэмакратыі. Сотні і тысячы старых сацыял-дэмакратычных рабочых рвуць сваю сувязь з сацыял-фашысткімі прафбюракратамі і ўліваюцца ў рады прафапазыцыі.

Як і пасьля гэраічнай барацьбы берлінскіх мэталістаў, быў створан рэвалюцыйны прафсаюз, таксама і ў Руры, у выніку яўнага здрадніцтва стачкі з боку сацыял-дэмакратаў, паўстала пытаньне аб стварэньні новага рэвалюцыйнага прафсаюзу вуглякопаў. Гэты прафсаюз ужо створан і ў гэтым, між іншым, заключаецца гістарычнае значэньне Рурскай забастоўкі. Цяпер, ужо ў рамках масавага рэвалюцыйнага прафсаюзу, вуглякопы Руру рыхтуюцца да рашаючай барацьбы.

Воля да барацьбы, рэвалюцыйны энтузіязм вуглякопаў ня зломаны часовым адступленьнем.

Доказам гэтага зьяўляецца барацьба вуглякопаў Верхняй Сілезіі, якая пачалася зараз-жа, ледзь толькі вуглякопы Руру вярнуліся да працы. І ў Верхняй Сілезіі на чале барацьбы стала прафсаюзная апазыцыя. І ў Верхняй Сілезіі гарнякі сустрэлі ў сваім наступленьні адзіны фронт дзяржавы, прадпрыемцаў і сацыял - дэмакратыі. У Верхняй Сілезіі таксама стаіць практычнае пытаньне аб стварэньні рэвалюцыйнага прафсаюзу.

Барацьба разгортваецца ва ўсіх галінах прамысловасьці. Ня толькі ў Нямеччыне, але і ў другіх краінах рабочыя стаяць у агні стачачнай барацьбы. У Англіі, у Паўднёвым Уэльсе, бастуюць 160 тыс. вуглякопаў. У Польшчы, Чэхаславакіі пасьпяваюць вострыя канфлікты ў горнай, мэталюргічнай і тэкстыльнай прамысловасьці. Гэта стачачная хваля зьліваецца з магутным рэвалюцыйным рухам дзесяткаў мільёнаў беспрацоўных ва ўсім капіталістычным сьвеце.

Тым большае значэньне набывае для міжнароднага пралетарыяту вопыт рурскай стачкі. Яна пераканае рабочых, што пераможная барацьба пралетарыяту магчыма толькі ў вострай барацьбе супроць сацыял-фашысцкіх правадыроў, пад сьцягам рэвалюцыйнага прафруху і камунізму.

Гэтыя баі зьяўляюцца сустрэчнай хваляй сацыялістычнага наступленьня міжнароднага пралетарыяту, яго магутным падтрыманьнем разгорнутага сацыялістычнага наступленьня ў нашай краіне. Сваёй энэргічнай рэвалюцыйнай барацьбой міжнародны пралетарыят моцна б'е на інтэрвэнцкіх замыслах імпэрыялістычных драпежнікаў і дапамагае сацыялістычнаму будаўніцтву СССР. Баі рурскіх, верхнясілескіх, уэльскіх вуглякопаў, вострыя канфлікты ў Польшчы і Чэхаславакіі наносяць рашучы ўдар па капітулянцкіх установах апартуністычных ныцікаў і малавераў у нас, яны разьбіваюць байкі правых аб немагчымасьці забастовачнай барацьбы ў час крызісу, яны парушаюць тэорыі аб «арганізаваным капіталізьме». Гэтыя баі выкрываюць контр-рэвалюцыйны характар трацкісцкіх капітулянцкіх, зараз адраджаемых «левакамі» установак у пытаньні аб разьвіцьці міжнароднай пралетарскай рэвалюцыі.

У гэтых баёх міжнародным пралетарыят пад кіраўніцтвам Камінтэрну мабілізуе свае сілы на абарону СССР—краіны будуючага сацыялізму.

ІНТЭРВЭНТЫ „РЫХТУЮЦЦА“

З Парыжа і Варшавы кожны дзень не перастаюць наступаць увесь час новыя весткі аб усё больш узмоцненай падрыхтоўцы гэтых дзяржаў да ўзброенага нападу на СССР.

Толькі што вярнуўшыся ў Парыж пасьля сваёй паездкі на інструктаваньні і прагляданьне баяздольнасьці белаэмігрантскіх і афіцэрскіх атрадаў у Югаславіі і Баўгарыі, **белагвардзейскі генэрал Мілер**—намесьнік Куценава, зусім адкрыта заяўляе буржуазнай францускай прэсе:

«Мы ўжо гатовы распачаць барацьбу. Чакаем—кажа белы генэрал Мюлер,—**на спрыяючыя міжнародныя ўмовы і фінансавую дапамогу, якую не замедліць нам даць адна з дзяржаў, што жадае вяшітчыць бальшэвізм і аддаць назад Расію ў рукі рускага народу».**

Далей гэты генэрал недабіткаў контр-рэвалюцыйных эмігрантаў-ніякаў дэкларуе міжнародняй буржуазіі, што на першым яе загадзе яны гатовы дайсьці да Масквы і вярнуць «усё старое»: вярнуць фабрыкі і заводы капіталістам, зямлю—абшарнікам, выкінуць царскія і свае даўгі, устанавіць «адзіную непадзельную Расію» і крывава расправіцца з рабочымі і працоўнымі масамі.

Гэтая адкрытая контр-рэвалюцыйная антысавецкая мова белагвардзейскага генэрала зьяўляецца моваю міжнароднага капіталу і ў першую чаргу **францускага і польскага імпэрыялізму,** гэтай мовай на працэсе «прампартыі», гаварылі іх агенты Рамэйн і інш., гэта ёсьць мова і польская фашызму, напалоханага штурмам надыходзячай рэвалюцыйнай навалніцы.

Буржуазія ў сьмяротным жаху перад пралетарскай рэвалюцыяй прызнае, што

«ва ўсім сьвеце бушуе, як у гарачым катле, гаспадарчы крызіс узьнімае на барацьбу вялікія масы, прыдушаныя цяжкімі ўмовамі быту, штурхае іх да першага зрушэньня, якім зьяўляецца палітычны пераварот» («Рэспубліка», 3-XII-1930 г.).

Буржуазія піш: ня можа прымірыцца з тым, што Савецкая краіна вольна ад зьверскай капіталістычнай эксплёатацыі, ад кабалы, руйнаваньня і ўціску абшарнікаў і кулакоў, ад фашысцкіх крывавых сатрапаў.

Гэта самая пілсудчыкаўская «Рэспубліка», якая гаворыць аб міжнародным «гарачым катле» і паказвае на необходнасьць імпэрыялістычнай экспансіі на Усход, не забылася сказаць і аб становішчы, а таксама аб ролі самой фашысцкай Польшчы.

«Польшча знаходзіцца на самай верхавіне кратэра вулькану»... а ў гэтым вулькане бушуе рэвалюцыйная лава і што раз мацней патрасае самыя падваліны панаваньня польскай буржуазіі, абшарнікаў і кулакоў.

Рабочая кляса і пад яе кіраўніцтвам працоўнае сялянства бунтуе, штурмуе фашыстскую дыктатуру. Аб гэтым ярка зазначаецца і на старонках сацыял-фашысцкага «Роботніка».

«Які страшэнны сапраўдны малюнак галечы і недаяданьня рабочага і польскага селяніна можна намаляваць. Мы дайшлі да такой граніцы гульні, **якая пагражае дзяржаве небясьпекай—рызыкай існаваньня.**

Роспач ёсьць вялікая і гэта роспач можа выбухнуць і гэта роспач выбухнуць мусіць, калі ня зьнішчым яе прычын... **Дзяржава трашчыць у асновах...»**

Сацыял-фашызм, як складаная і непарыўная частка фашысцкага лягеру, таксама шукае выхаду. Самымі крывавымі жорсткімі мэтадамі белага тэрору, карных экспедыцый сацыял-фашызм дапамагае Пілсудскаму душыць рэвалюцыйны рух. Ён дапамагае знайсьці выхад для фашысцкай Польшчы—Польшчы капіталістаў, абшарнікаў і кулакоў, каб узмацніць і надалей іх панаваньне. Сацыял-фашызм сам рыхтуе вайну супроць СССР ня менш энэргічна, чым пілсудчына.

Раз польскаму капіталу

«баз сумненьня найважнейшым экспэрымэнтам, як на сваіх разьмерах, так і выніках (чытай—жах перад гіганцкімі дасягненьнямі і посьпехамі сацыялістычнага будаўніцтва СССР і іх уплыў на ляўчэ большае зьяніцце рэвалюцыйнага руху), зьяўляецца расійская камуна...»,

дык

«...Польшча на толькі павінна, але мусіць ян найхутчэй распарушыць Усход...» («Рэспубліка»).

Ужо маскоўскі працэс над «прампартыяй», над простымі агентамі францускага і польскага імпэрыялізму, а ўсёй выразнасьцю праілюстраваў факты перад міжнародным пралетарыятам і працоўным сялянствам, а таксама і перад рабочымі і сялянамі Савецкага Саюзу падрыхтоўкі імпэрыялістаў да ўзброенага нападу, да задушэньня Савецкага Саюзу. Гэты працэс выкрыў інтэрвэнтаў, выкрыў іх пляны. Падрыхтоўка да нападу на СССР узмоцненымі тэмпамі вялася і цалкам адкрыта вядзецца і цяпер.

Гэтымі днямі дыктатар фашысцкай Польшчы, Пілсудзкі, пад прыкрыцьцём паездкі ў водпуск, з генэральнай і палкоўніцкай сьвітай, пры ахове 42-х лепшых шпікоў, **едзе ў Парыж, Лёндан і Жэнэву**—да Лігі Нацый. Ён едзе для таго, каб **асабіста лепш дагаварыцца аб арганізацыі новых плянаў, іх перабудове і вызначэньні тэрмінаў нападу.**

І недарма мапархічнае «Слова», кажучы аб паездцы Пілсудзкага заграніцу, проста бачыць у гэтым асобную місію, якая павінна ў хуткім часе прынесьці для Польшчы нейкае новае збаўленьне.

«У падарыжжы Пілсудзкага бачу гістарычнае дбаньне аб будучыні Польшчы».

Гэтыя словы вядомага ідэалёга польскага імпэрыялізму, які прадстаўляе інтарэсы польскіх капіталістаў, абшарнікаў і кулакоў на Заходняй Беларусі, зьяўляюцца вельмі паказальнымі і сьведчаць аб жаданьні хутка ажыцьцяніць пляны Пілсудзкага.

Выкрыцьцё контр-рэвалюцыйнай групы беларускіх нацыянал-дэмакратаў у Савецкай Беларусі моцна занепакоіла польскую буржуазію, яе прыхвасьніў—беларускіх нацыянал - фашыстаў на Зах. Беларусі. Па-перавце—выкрываюцца іх пляны на правядзеньні падрыхтоўкі ўзброенага нападу на СССР і, па-другое, дэмаскуюцца перад працоўнымі Польшчы, Зах. Украіны, і ў першую чаргу Зах. Беларусі, імпэрыялістычныя пляны польскага імпэрыялізму.

Маскоўскі працэс «прампартыі» дэмаскаваў імпэрыялістычныя пляны і частова накрываў іх, але ён ня мог спыніць падрыхтоўкі вайны супроць Савецкага Саюзу. Адкрыта гаворыць польскія фашысты, што гэта вайна зьяўляецца «гістарычнай необходнасьцю» («Рэспубліка») для Польшчы і ніякая сіла яе затрымаць ня можа, як яна можа «аблітага бэнзінай чалавека, які знаходзіцца ў полымі, ратаваць доктар».

Рабочыя і працоўныя сяляне Савецкага Саюзу, якія пад кіраўніцтвам ленінскай партыі заняты мірным будаўніцтвам сацыялізму ў сваёй краіне, ні на адну хвіліну не павінны забываць аб тых дэмаскаваных плянах міжнароднага і ў першую чаргу францускага і польскага імпэрыялізму, якія былі выкрыты на працэсе «прампартыі». Тыя факты, якія мы сёньня падаем, як інтэрвью белагвардзейца Мілера, а таксама паездку Пілсудзкага па генэральных штабах Эўропы, гаворыць, што тэрмін вайны шпаркімі крокамі набліжаецца. Міжнародная буржуазія старацца ажыцьцявіць гэтыя крывавыя пляны праз польскую, румынскую і францускую буржуазію.

Як ніколі, сёньня мы павінны быць на варце нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Яшчэ больш узмацніць абароназдольнасьць краіны і Чырвонай армі—галовага вартаўніка чырвоных межаў СССР і армій сусьветнага пралетарыяту.

Будзем напагатове!

Г-ч.

Актыўная падрыхтоўка белагвардзейшчыны да нападу на СССР

ПАРЫЖ, 15. **«Юманітэ»** указвае, што белагвардзейскі генэрал Мільлер у гутарцы з прадстаўнікамі ангельскай газэты «Сендэй Пыюс» пацьвердзіў, што «эміграцкая ваенная арганізацыя мае мэтай захаваць «белы» ваенны апарат, прызначаны, зразумела, для барацьбы з чырвонымі за вызваленьне Расіі», што «гэта арганізацыя зьвязана суровай дысцыплінай», што на Балканах ён «бачыўся з камандным складам мясцовых аддзелаў саюзу».

Спыняючыся на заяве Мільлера, што белагвардзейскім «вайсковым саюзам» арганізаваны «курсы для адпаўленьня ваенных ведаў і школы саюзу, якія ня носяць характару ваенных акадэмій», газэта задае пытаньне, чым гэтыя «курсы» адрозьніваюцца ад вайсковых школ і акадэмій і якую назву заслугоўваюць арганізаваныя белагвардзейцамі «вышэйшыя ваенна - навучальныя курсы», **«курсы ваенных ведаў»**, **«школы** уласканаленьня афіцэраў» і г. д. «Факт такі,—заяўляе «Юманітэ»,—што белая эміграцыя ваде на францускай тэрыторыі актыўную падрыхтоўку белай армії. Існаваньне ў Парыжы «курсаў» ці «школ» кіруюемых генэралам **Галовіным, не сустракае ніякіх перашкод з боку францускай улады і нават наадварот».**

Белагвардзейскі генэрал, — піша далей газэта, — наўрад ці зьбіраецца сам са сваімі 100 тыс. белагвардзейцаў ісьці на СССР. На якія-ж замежныя армії ён разьлічвае? Не, ён вельмі многа сказаў для таго, каб што-небудзь «абвергнуць».

«Юманітэ» падкрэсьлівае, што ўсе белая эміграцыя, у тым ліку група Мілюкова і Керанскага, аднадушны ў пытаньні ўзброенай інтэрвэнцыі, і заклікае францускіх рабочых змагацца супроць небясьпекі нападу на Савецкі Саюз. (ТАСС).

ПАДПАЛЬШЧЫКІ ВАЙНЫ

„ЗА РАБОТАЮ“

Мільярдныя падачкі на ўзбраеньні Польшчы і Румыніі

НА ТЭРЫТОРЫІ ФРАНЦЫІ РЫХТУЮЦЦА БЕЛАГВАРДЗЕЙСКІЯ КАДРЫ

ПРАЦОЎНЫЯ СССР ПАВІННЫ БЫЦЬ НА ВАРЦЕ

1 мільярд франкаў—на ўзбраеньне Польшчы

«Правда» зьмяшчае наступную тэлеграму з Берліну:

«Агенцтва Прэсс» паведамляе, што 30 студзеня ў Варшаву прыедзе адзін з дырэктароў францускага банку «Дэ Пэй дзю Норд» у якасьці галоўнага прадстаўніка банку і фірмы «Шнэндэр Крэзо» для завяршэньня перагавораў, якія ўжо вядуцца ў Варшаве аб **прадастаўленьні Польшчы пазыкі ў 1 мільярд франкаў, тэрмінам на 55 год.** Пазыка зьвязана з заказамі Польшчы францускай прамысловасьці. Тэхнічная частка дагавору ўжо абмеркавана.

Польшча намерана ператварыць Гдыню ў буйны ваенны порт. Новыя чыгуначныя лініі ня толькі даюць магчымасьць выкачкі верхнесілезскага вугалю, але **яўна прызначаны для чыста ваенных мэт.** Недалёка ад паўднёвай чыгункі знаходзіцца крэпасьць, дзе сабрана тэхнічнае навейшае ваеннае спараджэньне і дзе знаходзіцца пяты корпус. Кракаў зьвязан з Пшэмышлем (дзесяты корпус), Львовам (шосты корпус). Новыя чыгуначныя лініі забясьпечваюць перакідваньне войск з гэтых раёнаў.

Афіцыяльна ваенны бюджэт Польшчы 1930-31 году складае 1/3 усяго бюджэту; фактычна — больш, бо, апрача ваеннага, другія міністэрствы маюць асыгнаваньні на ваенныя мэты. Толькі паводле вылічэньняў газэты «Германія», польская рэгулярная армія разам з пагранічнымі войскамі налічвае **304 тыс. чалавек,** вайсковы бюджэт —922.770 тыс. золотых з агульнага бюджэту ў 2.935 мільёнаў. Акрамя таго, у кожным ваяводзтве знаходзіцца «камісія па фізычным выхаваньні і ваенная падрыхтоўкі», якая праводзіць ваенную падрыхтоўку моладзі.

На ўзбраеньні--мільёны, галадаючым--ні капейкі

ВАШЫНГТОН, 14. Марская камісія парляманту ўхваліла законапраект, які прадугледжвае асыгнаваньне 74 млн. даляраў на пабудову марскіх суднаў. У той-жа час урад і лідэры кангрэсу (парляманту) выказваюцца супроць законапраекту, які прадугледжвае асыгнаваньне 15 млн. даляраў на дапамогу і прадастаўленьне пазычак насельніцтву раёнаў, якія пацярпелі ад засухі. У гэтых раёнах **галадаюць сотні тысяч фермэрскіх сямей, у тым ліку і нягрыцянскіх.**

Польская ваенная школа ў Данцыгу

БЭРЛІН, 18. Правал «Дайлі Тагэсцэйтунг» паведамляе на падставе сакрэтнай інфармацыі, што **у Данцыгу ў памяшканьні польскага чыгуначнага прыпёнька патаемна існуе польская ваенна-навучальная ўстанова.** Усе вучні гэтай нелегальнай ваеннай школы рэгулярна ходзяць на палявыя заняткі ў раёны разьмяшчэньня польскіх ваенных часьцей у Данцыгскім калідоры.

Шалёныя тэмпы росту ўзбраеньняў ва ўсім сьвеце

ЛЁНДАН, «Сэндэй Экспрэс» прысьвячае спэцыяльны артыкул пытаньню аб узбраеньнях. Газэта заяўляе, што ня гледзячы на ўсе гутаркі аб разбраеньні, ня гледзячы на скліканьне шматлікіх канфэрэнцый, **сьвет не разбройваецца.**

Наадварот, за 12 год, якія мінулі пасьля вайны, узбраеньні ня толькі не паменшыліся, **але нават узрасьлі.** Да вайны выдаткі на ўзбраеньні складалі 700 млн. фунтаў стэрлінгаў у год. **Цяпер-жа выдаткі на ўзбраеньні перавышаюць мільярд фунтаў стэрлінгаў у год.** Ня гледзячы на тое, што Аўстрыя зьменшыла тэнаж падводных лодак і крэйсэраў, сусьветны тэнаж значна павялічыўся. **З 1913 г. сусьветны тэнаж крэйсэраў павялічыўся ў два разы.** У працэсу апошніх 6 год **асабовы склад флёту 5 кіруючых дзяржаў павялічыўся на 12 тыс. чал.**

Такі-ж працэс наглядаецца і ў арміях, прычым, асабліва вырасьлі амэрыканская і італьянская арміі. Выдаткі на паветраныя ўзбраеньні таксама шпарка растуць ва ўсім сьвеце.

Італія рашыла не адставаць ад Францыі

Супернічаньне паміж Францыяй і Італіяй на Міжземным моры з кожным днем павялічваецца. Францыя пачала заігрываць з Гішпаніяй, каб забясьпечыць сабе тыл на выпадак магчымых акупацыі супроць Італіі. **Францыя пачынае гутарку аб магчымым скарыстаньні гішпанскіх партоў у якасьці апорных пунктаў для суднаў францускіх ваенна-марскіх сіл.** Побач з дыпламатычнай гульнёй францускага міністэрства замежных спраў, марское міністэрства Францыі спаборнічае з Італіяй у галіне арганізацыі ваенна-марскіх сіл.

Француская суднабудаўнічая праграма 1931 г. прадугледжвае пабудову: аднаго 10.000-тоннага крэйсэра, шасьці эскадронных мінаносцаў, адзінаццаці падводных лодак, аднаго міннага заградзіцеля з агульным водазьмяшчэньнем у 45.000 тон.

Італьянская суднабудаўнічая праграма 1931 г. прадугледжвае пабудову: **аднаго дзесяці-тоннага крэйсэра, двох 8.000-тонных крэйсэраў, чатырох эскадронных мінаносцаў і дваццаці дзьвёх падводных лодак з агульным водазьмяшчэньнем у 43.000 тон.**

Морскія ўзбраеньні Японіі

Паводле вестак францускай ваенна-марской прэсы, **японскі ваенна-марскі бюджэт на 1931 г. зацьверджан у сумме 210,3 млн. іен. На новае ваенна-марское суднабудаўніцтва ў 1931 г. адпушчана звыш бюджэту 399 млн. іен.** На гэтыя 399 млн. іен. у 1931 г. пачнецца пабудова: **4 лёгкіх крэйсэраў, водазьмяшчэньнем па 8.600 тон; 12 эскадронных мінаносцаў па 1.400 тон; 9 падводных лодак з падводным водазьмяшчэньнем па 1.300 тон; 1 міннага заградзіцеля;** некалькіх кананерскіх лодак і мінаносцаў і, нарэшце, **188 самалётаў для ваенна-марскіх паветраных сіл Японіі. Да сучаснага моманту ваенна-марская авіацыя Японіі мела 191 самалёт.**

У сувязі з узмоцненым ростам марскіх паветраных сіл маркуецца ў бліжэйшым годзе пачаць пабудову авіябазы ў Яхама (недалёка ад Іокасукі).

РАЗГРОМ

2-Х НАНКІНСКІХ ДЫВІЗІЙ

БЭЙПІН, 12. Японскае агенцтва Дэмпо-Цусін паведамляе з Ханькоу, што ў правінцыі Цзяньсі кітайскія чырвонаармейскія атрады атрымалі бліскучую перамогу, АБЛЯЗЕРОЎШЫ 18-Ю ДЫВІЗІІ ЮНАНКІНСКІХ ВОЙСК. Нарэшце, гэтыя чырвонаармейскія атрады аб'ядналіся з атрадамі Чжу-дэ і Мао-Цзе-Дуна і НАНЕСЬЛІ ПАРАЖЭНЬНЕ 50 ДЫВІЗІІ НАНКІНСКАГА ВОЙСКА. Агенцтва адзначае, што часьці кітайскай Чырвонай армії займаюць рад раёнаў на поўдні Цзяньсі, на поўначы Гуайсі і на поўдні Хубэя.

***

БЭЙПІН, 12. Паводле паведамленьня газэт, кітайскія чырвонаармейскія атрады заняліі горад Юнцьэін у паўночна-заходняй частцы правінцыі Фуцзянь.

Баі з нанкінцамі маюць выключны па жорсткасьці характар

ШАНХАЙ, 12. З кожным днём наступаюць усё новыя і новыя паведамленьні, якія ўказваюць на правал «грандыёзнай» кампаніі, якая была арганізавана пад кіраўніцтвам Нанкіна правіцыяльнымі ўрадамі супроць кітайскіх чырвоных армій пад лёзунгам «зьнішчэньне камуністаў за тры месяцы». Падрабязных вестак пра баі, якія адбываюцца, няма. Ёсьць толькі асобныя ўказаньні, якія сьведчаць аб выключна жорсткім характары кампаніі і пра поўнае гаміньным супраціўленьні чырвоных армій. Газэта «Сінь-Вень-Бао», на падставе апошніх зводак, паведамляе аб апошніх жорсткіх баёх **у раёне Лунгам (у правінцыі Цзянсі).** У гэтых баёх з чырвонымі часьцямі, якімі кіруюць Чжу-дэ і Мао-Цзе Дун войска Цзянсінскага правінцыяльнага ўраду мела вялізарныя страты і прымушана было адступіць з мэтай папаўненьня сваіх радоў. У раёне Тунгуо, які перайшоў на некаторы час назад у рукі войска правінцыяльнага ўраду, усё яшчэ працягваецца жорсткая барацьба, яна паказвае на тое, што атрыманая там урадам шырока афішыраваная «перамога» аусім ня была рашучай і доўгай. Ёсьць нават неправерныя чуткі, што гэты раён зноў заняты чырвонымі. Ня больш усьцешныя весткі паступаюць і з **Фуцзянскай правінцыі,** дзе чырвоныя арміі ў выніку распачатага наступленьня зноў **аўладалі раёнам Юнцьэін** (на паўднёвым захадзе Фуцзянскай правінцыі). У мясцовых імпэрыялістычных колах ня скрываюць незадаваленьня з прычыны беспасьпяховасьці кампаніі Нанкіна супроць чырвоных армій і адкрыта раяць ураду на спыніцца **перад поўным зьнішчэньнем усяго насельніцтва «заражаных» раёнаў** (ТАСС).

У ЗАХ. БЕЛАРУСІ

Масавыя арышты у Стаўпецкім павеце

Як падае ў № 4 «Кур'ер Віленскі», апошнімі днямі адбыліся масавыя арышты сярод сялянства ў Стаўпецкім павеце (Зах. Беларусь). Паводле паведамленьня паліцыі, на абшарах павету нібы ліквідавана 4 камуністычныя ячэйкі.

У часе вобыску захоплена нібы шмат кампрамэтуючых матар'ялаў. **Арыштавана 11 чалавек.**

10-га студзеня, па вестках таго-ж «Кур'ера Віленскага», паблізу Вілейкі ў памяшканьні мясцовага кармчара Пульмана паліцыяй нібы арыштавана камуністычная масоўка ў складзе 7-мі чалавек.

У часе вобыску ў памяшканьні нібы захоплены важныя інструкцыі, лісты МОПР'у і літаратура. Усе ўдзельнікі масоўкі арыштаваны.

„Пламенная любовь“ да фашысцкай дыктатуры

Фашысцкія пісакі зараз-жа пасьля выбараў у сойм на ўвесь сьвет пачалі трубіць аб тым, што беларускія і украінскія масы на так званых «крэсах усходніх» (Зах. Беларусь, Зах. Украіна) «запалалі такою любоўю да маршала Пілсудзкага, што аднагалосна і адкрыта галасавалі за фашысткі выбарчы сьпіс».

Уся фальш і фабрыкацыя выбараў, а таксама той шалёны тэрор, ва ўмовах якога адбываліся выбары ў сойм, асьвятляліся ня раз ужо на старонках «Зьвязды». Аб гэтай «любві» да фашысцкай дыктатуры найлепш за ўсё сьведчаць факты падпалу панскіх маёнткаў у Зах. Беларусі. На працягу аднаго толькі апошняга тыдню ў фашысцкай прэсе, ня гледзячы на цэнзурныя ўмовы, падана некалькі выпадкаў падпалу панскіх маёнткаў. Так, напрыклад, «Кур'ер Віленскі» піша: «4-га студзеня выбухнуў гроазны пажар у фальварку **Мышкаўшчызна,** Мядзёльскай воласьці. Пажар выбухнуў адразу ў трох месцах. Згарэлі ўсе будынкі **асадніка—Вайцяхоўскага.** Страты—на 18 тыс. злотых.

— 14-га студзеня падпалены фальварак Грагораўшчызна, Альшанскай воласьці. Згарэлі ўсе будынкі, а таксама і інвэнтар **памешчыка Даўнаровіча.** Страты—на 15 тыс. злотых.

Сапраўды «пламенная любоўь» да фашысцкай дыктатуры.

КЛЯСА СУПРОЦЬ КЛЯСЫ



У Сіднэ і (Аўстралія) адбыліся крывавыя сутычкі паміж рабочымі і паліцыяй, у часе якіх былі цяжка паранены 5 дэманстрантаў. На здымку параненыя дэманстранты.

Усеагульная забастоўка швэдзкіх тэкстыльшчыкаў

СТАКГОЛЬМ, 12. Пачалася ўсеагульная забастоўка 33 тыс. швэдзкіх тэкстыльшчыкаў. Забастоўка абвешчана ў сувязі са зьніжэньнем прадпрыемцамі зарплаты ў адказ на патрабаваньне рабочых аб яе павышэньні на 10 проц. (ТАСС).

Забастоўка на газавым заводзе ў Варшаве

ВАРШАВА, 14. У сувязі са зьніжэньнем заработнай платы, **14-га студзеня забаставалі рабочыя газавага заводу.** Калі перагаворы скончацца бязрэзультатна, пагражаюць забастоўкай таксама рабочыя трамваю і гарадзкіх тэатраў. Пэпэсэўскі прафсаюз і прафсаюз яваруўшчыкаў узмоцнена імкнуцца перашкодзіць забастоўцы.

Бурныя дэманстрацыі беспрацоўных у Чыкаго

НЬЮ-ЁРК, 14. Па паведамленьні «Дэйлі Уоркэр», 12.000 беспрацоўных паладзілі дэманстрацыю на галоўных вуліцах Чыкаго, патрабуючы работы і хлеба. Пасьля дэманстрацыі беспрацоўныя заходзілі ў рэстараны, елі стравы і выходзілі, адмаўляючыся плаціць. Па словах газэты, беспрацоўныя прапанавалі ўладарам рэстаранаў «пасылаць рахункі мэру для аплаты».

Усьлед за Рурам гарнякі Верхняй Сілезіі стварылі чырвоны прафсаюз

БЭРЛІН, 13. У Гіндэнбургу (В. Сілезія), у прысутнасьці некалькіх соцень делегатаў ад капальняў, **быў створаны рэвалюцыйны саюз вуглякопаў Верхняе Сілезіі.** Апрача делегатаў на канфэрэнцыі прысутнічала шмат гасьцей, у тым ліку многа жанчын, якія прымалі актыўны ўдзел у спрэчках і на ўсёй работе канфэрэнцыі. Верхнясілескія гарнякі атрымалі прывітальныя тэлеграмы ад делегацкай канфэрэнцыі рурскіх вуглякопаў і ад канфэрэнцыі рэвалюцыйных чыгуначнікаў. Выступаўшы ад імя ЦК нямецкай кампартыі **тав. Крэйцбург** падкрэсьліў значэньне забастоўкі верхнясілескіх гарнякоў, **таксама як і** значэньне стварэньня рэвалюцыйнага саюзу гарнякоў.

З вялікім дакладам аб забастоўцы, вурках забастоўкі і аб стварэньні рэвалюцыйнага саюзу гарнякоў выступіў прадстаўнік агульнанямецкага камітэту рэвалюцыйнае прафпазыцыі, тав. **Альбэрт Функ.**

Канфэрэнцыя, пры агульным энтузіязме ўдзельнікаў яе, пастанавіла стварыць рэвалюцыйны прафсаюз гарнякоў і абрала кіруючы органы новага саюзу.

Паўмільёна ланкашырскіх тэкстыльшчыкаў—пад пагрозаю лёкаўту

ЛЁНДАН, 12. Прадпрыемцы Ланкаширскай ткацкай прамысловасьці апавясьцілі аб лёкауце усіх рабочых ткацкай прамысловасьці Ланкашыру з 17 студзеня, калі толькі за гэты тыдзень ня будзе ўрэгулявана канфлікт на прадпрыемствах у раёне Бэрлі (у раёне Бэрлі бастуе 25 тыс. тэкстыльшчыкаў, пратестуючых супроць уведзеньня шмат варыянтнай сыстэмы). **Лёкаут закранае непасрэдна 250 тыс. ткачоў, прычым, усьлед за гэтым лёкаутам у хуткім часе застануцца без работы яшчэ 250 тыс. рабочых, занятых на прадзільных прадпрыемствах.** Ланкаширскія прадпрыемцы пастанавілі дабіцца ўведзеньня шматварыянтнай сыстэмы і карыстаюцца ў гэтых адносінах дапамогай рэфармісцкай прафбюракратыі. 13 студзеня адбудзецца сустрэча прадстаўнікоў выканкому прадпрыемцаў і выканкому ткачоў. Прафбюракраты з выканкому абяцаньня ткачоў дабіваюцца ўмяшканьня ўраду ў канфлікт. Трэд'юніяністкія прафбюракраты закуль яшчэ ня склікалі ніводнага мітынгу тэкстыльшчыкаў у Ланкашыры, імкнучыся вынішчыць да шчэнту базы дух тэкстыльшчыкаў. Толькі забастовачныя камітэты меншасьці, наладжваюць штодзенна мітынгі, растлумачваючы ход падзеяў, папулярызуючы праграму руху меншасьці, арганізуючы пікеты і дэманстрацыі салідарнасьці. (ТАСС).

Сялянскае паўстаньне на Філіпінскіх выспах

ШАНХАЙ, 13. З Філіпінскіх выспаў паступаюць паведамленьні аб сялянскіх паўстаньнях у ваколіцах гораду Тайюнг (у правінцыі Пангасінан). Амэрыканскія і ангельскія агенцтвы і друк прабуюць растлумачыць паўстаньні рэлігійным фанатызмам племяні Голярум, якое паставлена па-за законам. Аднак, у паўстаньні прымаюць удзел выключна сяляне. Паўстанцы імкнуцца да захопу ўлады на Філіпінскіх выспах. У лёзунгах паўстанцы

За выразнае правядзеньне ленінскай лініі ў практычнай рабоце

Няздольных кіраўнікоў Чарэйскай арганізацыі зьняць з работы і прыцягнуць да суровай адказнасьці

Палітычныя прарывы ў рабоце Гарадоцкай і Чарэйскай партарганізацый — вынік апартуністычнага кіраўніцтва, слабай мабілізацыі мас на змаганьне супроць правага і „левага" апартунізму ў тэорыі і на практыцы, і прымірэнцтва, дрэннага разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі ў даных арганізацыях

Урокі Чарэі і Гарадка

Вызначаная сьнежаньскім пленумам ЦК і ЦКК УсеКП(б) праграма «завяршыць пабудаваньне фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР» абавязвае партыйныя арганізацыі рашуча і няўхільна павышаць ідэйна-палітычны ўзровень і бальшавіцкую пільнасьць партыйных мас, весьці бязьлітаснае змаганьне на два фронты супроць правага і «левага» апартунізму ў тэорыі і на практыцы, мабілізаваць шырокія пралетарскія і працоўныя масы на забесьпячэньне бальшавіцкіх тэмпаў трэцяга рашаючага году пяцігодкі. Толькі на аснове няўхільнага ажыцьцяўленьня сваёй ленінскай генэральнай лініі партыя зможа дабіцца «завяршэньня грандыёзнага пляну работ па будаўніцтве сацыялізму — пяцігадовага пляну».

Гэтай бальшавіцкай ісьціны не разумеюць толькі апартуністы з ліўна правага і «плавацкага» пягеру, не разумеюць толькі бяспрынцыпныя прымірэнцы — заступнікі і абаронцы апартуністаў. Апартуністы ўсіх колераў сваёй барацьбой супроць генэральнай лініі партыі граюць на руку кулацкім і розным капіталістычным элемэнтам унутры краіны, граюць на руку сусьветным імпэрыялістам.

Ніжэй мы зьмяшчаем допісы аб буйных палітычных прарывах і грубых скажэньнях лініі партыі ў Чарэйскай і Гарадоцкай партарганізацыях.

Дзе корань гэтых прарываў і скажэньняў партыйнай лініі?

Прычыны заложаны ў наяўнасьці правааапартуністычных настроеў у кіраўнічай верхавіне гэтых арганізацый. У Гарадоцкай партарганізацыі, напрыклад, правааапартуністычнае кіраўніцтва дайшло да адкрытага змаганьня супроць генэральнай лініі партыі, дайшло да зьніжэньня тэмпаў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі (скарачэньне пляну пасеўнай кампаніі, ігнараваньне раду важнейшых задач і інш.). Гэта здарылася ў рэзультаце таго, што партыйныя масы — ізноў-такі па віне апартуністычнага кіраўніцтва — ня былі мабілізаваны на непрымірымае змаганьне супроць галоўнай небясьпекі на даным этапе — правага апартунізму ў тэорыі і на практыцы, «лявацкіх» скажэньняў генэральнай лініі партыі і бяспрынцыпнага прымірэнцтва да ўхілаў ад бальшавізму. Такое становішча пагпыбляецца яшчэ тым, што апартуністы з кіруючай верхавіны РК і РКК дэзарыентавалі партыйныя масы ў пытаньні змаганьня на два фронты. У пастановах пленуму райкому і раённай кантрольнай камісіі асобныя пункты накіраваны на апраўданьне адсутнасьці ў арганізацыі змаганьня супроць правага апартунізму. Зьмест гэтых пунктаў зводзіцца да таго, што, моў, арганізацыя выкараняла «левыя» перагібы, дапушчаныя ў пачатку мінулага году, і не таму магло весьці змаганьня супроць правага апартунізму. Гэта ёсьць тыповы прыклад няўменьня і нежаданьня весьці барацьбу на два фронты. Апартуністычнае кіраўніцтва Гарадоцкай арганізацыі гэтым самым затушоўвала небясьпеку правага апартунізму, як галоўную на даным этапе, фактычна адмовілася ад змаганьня на два фронты.

Скаціўшыся ў балота апартунізму, кіраўніцтва Гарадоцкай арганізацыі правапіла рад важнейшых палітычных і гаспадарчых кампаній, якія праводзіліся партыяй на вёсцы, не ўзмацніла наступленьня на кулацтва (загатоўкі, уборка ўраджаю, асеньняя сяўба, недаведзеньне да кулака цьвёрдых заданьняў і інш.).

Сваю правааапартуністычную практыку апартуністычныя кіраўнікі на працягу ўсяго часу прыкрывалі заслонай «благополучия». Апошняе дасягалася толькі таму, што вастрата бальшавіцкай самакрытыкі ня была накіравана на змаганьне супроць праву апартунізму на практыцы, што пёзунг партыі аб самакрытыцы не даведзены да мас.

Бяспрынцыпнае прымірэнцтва да апартунізму паасобных членаў бюро райкому, разбаўленае чужой, ня вартай камуніста сямейнасьцю, прывяло да выступленьня прымірэнцаў супроць раду пункту палітычнай пастановы ЦК КП(б)Б аб становішчы ў Гарадоцкай арганізацыі. І сапраўды, чаго варта такая пастаноўка пытаньня прыхвасьнымі апартуністаў — прымірэнцамі?

Мы, моў, — гавораць яны, — з палітычнай ацэнкай становішча, якая дана рэзалюцыяй ЦК, згодны, але... адносна арганізацыйных высноваў трэба пагаварыць, пераглядзець.

Хіба такая пастаноўка пытаньня варта камуніста?

Ні ў ліпе разе. Толькі апартуніст можа апусьціцца да такой бяспрынцыпнасьці, можа асабістыя ўзаемаадносіны ставіць вышэй змаганьня за высокапрынцыповую палітыку партыі.

Апартуністычнае кіраўніцтва Гарадоцкай арганізацыі ў асобе сакратара РК Райсіна і іншых зьнята з работы. Аднак, гэта палёка ня значыць, што там ліквідавана правааапартуністычная практыка. Патрэбна шмат сіл і энэргіі для таго, каб выкараніць грубыя скажэньні партыйнай лініі. Патрэбна ўзмоцненая мабілізацыя мас на змаганьне за выразнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, на ўзмацненьне націску на кулацкія элемэнты вёскі.

Зьмяшчэньнем карэспандэнцыі з Чарэі мы сыгналізуем аб аналёгічным становішчы ў Чарэйскай арганізацыі. Там, як і ў Гарадоцкай партарганізацыі, апартуністычнае кіраўніцтва дазволіла правааапартуністычнае кіраўніцтва дайшло да адкрытага змаганьня супроць генэральнай лініі партыі, дайшло да зьніжэньня тэмпаў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі (скарачэньне пляну пасеўнай кампаніі, ігнараваньне раду важнейшых задач і інш.). Гэта здарылася ў рэзультаце таго, што партыйныя масы — ізноў-такі па віне апартуністычнага кіраўніцтва — ня былі мабілізаваны на непрымірымае змаганьне супроць галоўнай небясьпекі на даным этапе — правага апартунізму ў тэорыі і на практыцы, «лявацкіх» скажэньняў генэральнай лініі партыі і бяспрынцыпнага прымірэнцтва да ўхілаў ад бальшавізму. Такое становішча пагпыбляецца яшчэ тым, што апартуністы з кіруючай верхавіны РК і РКК дэзарыентавалі партыйныя масы ў пытаньні змаганьня на два фронты. У пастановах пленуму райкому і раённай кантрольнай камісіі асобныя пункты накіраваны на апраўданьне адсутнасьці ў арганізацыі змаганьня супроць правага апартунізму. Зьмест гэтых пунктаў зводзіцца да таго, што, моў, арганізацыя выкаранялася «левыя» перагібы, дапушчаныя ў пачатку мінулага году, і не таму магло весьці змаганьня супроць правага апартунізму. Гэта ёсьць тыповы прыклад няўменьня і нежаданьня весьці барацьбу на два фронты. Апартуністычнае кіраўніцтва Гарадоцкай арганізацыі гэтым самым затушоўвала небясьпеку правага апартунізму, як галоўную на даным этапе, фактычна адмовілася ад змаганьня на два фронты.

Скаціўшыся ў балота апартунізму, кіраўніцтва Гарадоцкай арганізацыі правапіла рад важнейшых палітычных і гаспадарчых кампаній, якія праводзіліся партыяй на вёсцы, не ўзмацніла наступленьня на кулацтва (загатоўкі, уборка ўраджаю, асеньняя сяўба, недаведзеньне да кулака цьвёрдых заданьняў і інш.).

Сваю правааапартуністычную практыку апартуністычныя кіраўнікі на працягу ўсяго часу прыкрывалі заслонай «благополучия». Апошняе дасягалася толькі таму, што вастрата бальшавіцкай самакрытыкі ня была накіравана на змаганьне супроць праву апартунізму на практыцы, што пёзунг партыі аб самакрытыцы не даведзены да мас.

Бяспрынцыпнае прымірэнцтва да апартунізму паасобных членаў бюро райкому, разбаўленае чужой, ня вартай камуніста сямейнасьцю, прывяло да выступленьня прымірэнцаў супроць раду пункту палітычнай пастановы ЦК КП(б)Б аб становішчы ў Гарадоцкай арганізацыі. І сапраўды, чаго варта такая пастаноўка пытаньня прыхвасьнымі апартуністаў — прымірэнцамі?

Мы, моў, — гавораць яны, — з палітычнай ацэнкай становішча, якая дана рэзалюцыяй ЦК, згодны, але... адносна арганізацыйных высноваў трэба пагаварыць, пераглядзець.

Хіба такая пастаноўка пытаньня варта камуніста?

Ні ў ліпе разе. Толькі апартуніст можа апусьціцца да такой бяспрынцыпнасьці, можа асабістыя ўзаемаадносіны ставіць вышэй змаганьня за высокапрынцыповую палітыку партыі.

Апартуністычнае кіраўніцтва Гарадоцкай арганізацыі ў асобе сакратара РК Райсіна і іншых зьнята з работы. Аднак, гэта палёка ня значыць, што там ліквідавана правааапартуністычная практыка. Патрэбна шмат сіл і энэргіі для таго, каб выкараніць грубыя скажэньні партыйнай лініі. Патрэбна ўзмоцненая мабілізацыя мас на змаганьне

Як гарадоцкія апартуністы „выпраўлялі" генэральную лінію партыі

Абсьледаваньне работы Гарадоцкай партарганізацыі выявіла рад фактаў апартуністычнага скажэньня генэральнай лініі партыі паасобнымі камуністамі і кіруючымі органамі раёну.

Матар'ялы абсьледаваньня сьведчаць аб тым, што фракцыя райвыканкому, замест змаганьня за поўнае выкананьне пляну асеньняй сяўбы, распрацавала «свой» план, які значна скарачаў пасеўную плошчу ў раёне і дэзарганізаваў вясковыя партыйныя ячэйкі і сельсаветы па выкананьні пляну сяўбы.

Унесеныя «папраўкі» райвыканкомам прывялі да таго, што **план, зацьверджаны НКЗ па Гарадоцкім раёне выкананы усяго на 71 проц.** Апартуністы з райвыканкому, скараціўшы пасеўны план, аказалі гэтым самым вялізарную дапамогу кулацтву, якое змагалася супроць пашырэньня пасеўнай плошчы як у адзіпаасобным, так і калгасным сэктары.

Скарачэньне пасеўнага пляну адбывалася з ведама бюро і пленуму райкому партыі. **На пленуме адкрыта выступалі асобныя члены райкому і ўносілі прапанову аб скарачэньні пасеўнага пляну, як нерэальнага, які ні ў якім разе ня можа быць выкананы.** Райком партыі, замест таго, каб выкрыць апартуністычныя ўстаноўкі фракцыі райвыканкому, замест таго, каб даць рашучы адпор апартуністам і мабілізаваць партарганізацыю на выкананьне і перавыкананьне пасеўных пляноў, паставіў штамп на пляны РВК і арыентаваў партарганізацыю на выкананьне не максымальных, а мінімальных пляноў.

Важнейшыя заданьні партыі і ўраду аб зяблеве (якое забясьпечвае посьпехі ў веснавой пасеўнай кампаніі) Гарадоцкім раёнам ня выкананы.

У справаздачы райкому і райвыканкому запісана, што асеньняя - уборачная кампанія праведзена ў раёне з вялікім посьпехам. Каб упэўніцца ў тым, што гэта ацэнка ніколькі не адпавядае сапраўднаму становішчу, досыць прывесьці той факт, што **60 проц. усяго ільну, засеянага калгасамі, засталося пад сьнегам, што ў палове калгасаў на палёх парасло жыта, авёс і г. д.**

Справаздача райкому в усёй выразнасьцю выкрывае імкненьні работнікаў райкому змазаць правалы ў рабоце партарганізацыі, увесьці ў зман вышэйшыя кіруючыя парторганы і наіснуючымі посьпехамі прыкрыць сваю правааапартуністычную практыку.

У свой час сакратарыят ЦК прыцягнуў да суровай партыйнай адказнасьці Гарадоцкі РК КП(б)Б і фракцыю райвыканкому за зрыў мясазагатовак, за невыкананьне пляну асьняй сяўбы і папярэдзіў раённыя кіруючыя органы аб неабходнасьці ў мінімальны тэрмін ліквідаваць прарывы ў гаспадарча-палітычнай работе раёну. Пастанова сакратарыяту ЦК нічаму не навучыла кіраўніцтва Гарадоцкага раёну.

Важнейшыя гаспадарча - палітычныя кампаніі ў раёне правалены: мабілізацыя сродкаў, загатоўкі бульбы, ільну, валакна, сіласаваньня і г. д.

Пытаньне аб выкананьні пляну загатовак абмяркоўвалася на аб'яднаным пленуме РК і РКК КП(б)Б.

Досыць азнаёміцца з пастановамі пленуму, каб упэўніцца ў тым, што яны ні ў якім разе не адпавядаюць пастановам кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б, не адпавядаюць лёзунгу партыі аб барацьбе на два фронты супроць правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі і супроць трацкісцкіх, «лявацкіх» наскокаў на партыю. У 2-м і 5-м пунктах пастановы пленуму гаворыцца аб тым, што райком і партарганізацыя не маглі змагацца з правааапартуністычнай практыкай, бо райком займаўся выкарэненьнем «левых» загібаў, якія былі дапушчаны ў мінулую вясну. Пленум, прыняўшы такую пастанову, фактычна адмовіўся аб мабілізацыі партарганізацыі на змаганьне з правааапартуністычнай практыкай, адмовіўся выкінуць са сваіх радоў людзей, якія работу па ажыцьцяўленьні генэральнай лініі партыі падмянілі работай, накіраванай на карысьць клясавага ворага.

Пленум прайшоў міма такіх пытаньняў, як апартуністычная стаўка на самацёк у радзе сельсаветаў па пытаньнях заттовак, як прадстаўленьне ільгот кулаку ў загатоўках. Пленум не заўважыў, што ў радзе сельскіх саветаў не даведзены цьвёрдыя заданьні па загатоўках да кулацка - заможнага двара.

Пастановы пленуму яшчэ раз выразна падкрэсьліваюць няздольнасьць раённага кіраўніцтва змагацца за генэральную лінію партыі, за рэканструкцыю сельскае гаспадаркі, няздольнасьць даць жорсткі адпор абаронцам кулацтва.

Партыйная арганізацыя не зьвязвала правядзеньне гаспадарча - палітычнай кампаніі з работай па калектывізацыі. Работа па замацаваньні існуючых калгасаў, па арганізацыі прыліву, ня была пастаўлена ў цэнтры ўвагі кожнай вясковай партыйнай ячэйкі. Работа вясковых і калгасных ячэек не перабудавана ў адпаведнасьці з задачамі, якія паставіла партыя.

Аб якасьці партыйнага кіраўніцтва пытаньнямі калектывізацыі сьведчаць такія факты: у раёне калектывізавана ўсяго 7 проц. бяднацка серадняцкіх гаспадарак; частка калгасаў развалілася ці знаходзіцца на пярэдадні рэвалу. Паасобныя члены партыі адкрыта выступалі на сходах калгасьнікаў і ўносілі прапановы аб роспуску калгасаў і стварэньні хутароў.

Характэрна, што пленум райкому і РайКК, які абмяркоўваў работу партарганізацыі, не заўважыў вялізарных прарываў па калектывізацыі, не заўважыў наяўнасьці апартуністычнай практыкі як у паасобных ячэйках, так і ў раённым кіраўніцтве.

Галоўнай прычынай вялізарных прарываў у рабоце Гарадоцкай партарганізацыі трэба лічыць адсутнасьць шырока разгорнутай самакрытыкі. Самакрытыка ня была разгорнута так, каб яна спрыяла выкрыцьцю і ліквідацыі правай практыкі, узьнікаючу бяздольнасьці партыйных ячэек. Бюро райкому на чале з сакратаром Райсіным замест таго, каб разгортваць самакрытыку, ужывала ўсе захады да яе заціску, зводзячы прынцыповую крытыку да дробязай.

Нельга не адзначыць, што адказныя работнікі райкому прымалі ўсе меры, каб прымусіць партыйны актыў раёну стаць на абарону апартуністаў з раённых устаноў, на якіх сакратарыят ЦК у пастанове ад 11 лістапада мінулага году налажыў партыйныя спагнаньні. Бюро райкому, унёсшы прапанову на пленуме — **«прызнаць правільным і поўнасьцю заслужанымі партспагнаньні, вынесеныя сакратарыятам ЦК КП(б)Б кіраўніцтву РК і фракцыі РВК»**, у той-жа час упарта патрабавала ад пленуму, каб апошні прыняў наступны пункт: **«Прымаючы пад увагу, што асабістая адказнасьць з т. Райсіна, як сакратара РК і члена РВК за дапушчаныя прарывы ня зьнімаецца, але, улічваючы яго работу ў арганізацыі і цьвёрдыя рашучыя мерапрыемствы, якія ён прымаў па выкананьні пляну гаспадарча - палітычных кампаній, прасіць ЦК пераглядзець пастанову аб сакратары РК т. Райсіне».**

Адначасова прызнаваць правільнай пастанову сакратарыяту ЦК і прасіць ЦК скасаваць яе, як не адпавядаючую сапраўднаму становішчу ў раёне — вельмі характэрны мэтад апартуністаў - членаў бюро РК у прызнаньні і выпраўленьні сваіх памылак.

Мы лічым, што ўнесеная прапанова членамі бюро райкому на пленуме аб зьняцьці спагнаньня за апартуніста Райсіна, зьяўляецца фактам недапушчальнага прымірэнцтва, якое мяжуе з двурушніцтвам і фактам упартага нежаданьня часткі раённага партыйнага актыву прызнаць наяўнасьць правааапартуністычнай практыкі ў арганізацыі, асудзіць гэту практыку і змагацца супроць правага апартунізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе.

Бюро ЦК, заслухаўшы паведамленьне аб становішчы ў Гарадоцкай партарганізацыі, пастанавіла, **зьняць з работы сакратара райкому Райсіна, старшыню райвыканкому і іншых раённых работнікаў.**

М.

Аб палітычных правалах у кіраўніцтве Чарэйскай арганізацыі і душыцелі самакрытыкі Фахэнгаўзе

За грубыя скажэньні партыйнай лініі, за правааапартуністычную практыку каля паўгода таму назад было абвешчана **партыйнае кіраўніцтва Чарэйскай арганізацыі КП(б)Б.** Туды быў пасланы на работу новы сакратар райкому. Аднак пасьля абнаўленьня раённага партыйнага кіраўніцтва скажэньні партыйнай лініі ня толькі ня выпраўлены, а наадварот, грубыя палітычныя памылкі яшчэ паглыбіліся.

Факты правааапартуністычнай практыкі ў Чарэйскай арганізацыі пануюць ня толькі ў рабоце паасобных камуністаў, а і ў рабоце раду парт'ячэек. Член партыі **Рубін** лічыць, што **«беднату ў калгас прымаць ня трэба, бо яна нічога не дае для разьвіцьця калектывізацыі».** Старшыня калгасу (вёскі Гілі), ён-жа сакратар парт'ячэйкі, **Сталяроў** ігнаруе калгасьнікаў-ударнікаў і ўсямерна захвочвае асоб, пазбаўленых выбарчых правоў, якія **пралезьлі** ў калгас. Гэты, з дазволу сказаць, каміяіст выдаў прэмію **пішэнцу Салтанаву зэ ўпакоўку яблык каля 5-ці тон жыта і 800 руб. грашыма.** А прэмію, атрыманую калгасам за здачу свае прадукцыі, падзяліў з **Трыпуціным.** Між іншым гэты Сталяроў пры разьмеркаваньні дэфіцытных тавараў самазабясьпечваўся. Сваёй жонцы, якая ніколі ня выходзіла на работу ў калгас, выдаў абутак, у той час, як **калгасьніца-ўдарніца, былая бяднячка тав. Халяўка ходзіць амаль зусім босая.** Такімі ўчынкамі калгасьнікі абураны і ставяць пытаньне аб сваім выхадзе з калгасу. Кулацкага агента Сталярова гэта ня трывожыць. Ён крычыць на калгасьнікаў: «Выходзьце з калгасу к чорту хоць усе, я прывязу сабе калгасьнікаў колькі хочаце з Дубаўскага сельсавету».

Старшыня другога калгасу ў вёсцы Папоўка **Сьвірыдовіч** агітуе калгасьнікаў, каб ня выходзілі на работу таму, што яна быццам дрэнна аплачваецца.

У **Вецерскай** парт'ячэйцы апартуністычныя кулацкія настроі знайшлі шырокае распаўсюджаньне. Там рад «партыйцаў», спэкулюючы на труднасьцях сацыялістычнага будаўніцтва, адкрыта выступаюць супроць пяцігодкі. Там сярод паўнай часткі «партыйцаў» пагулваюць антысавецкія кулацкія анэкдоты і г. д. **Член ячэйкі Аляшкевіч дакаціўся да простай здрады партыі** (папярэджаньне кулака аб раскулачваньні і інш.).

У радзе ячэек панурае апартуністычная недапацэнка работы сярод батрацтва і беднаты. У **Хальнявіцкай,** напрыклад, ячэйцы лічаць непатрэбным арганізоўваць беднату ў калгасы, матывуючы гэта тым, што ў беднаты няма сродкаў вытворчасьці.

У мястэчку **Абчуга** з 32-х сем'яў яўрэйская беднаты арганізаваўся калгас, але па распараджэньні сакратара райкому **т. Фахэнгаўза** раённыя ўстановы калгас не зацьвердзілі. Чым абгрунтавана гэта галавацяпскае распараджэньне сакратара—сказаць цяжка.

Гаворачы аб рабоце сярод беднаты, нельга не паказаць па такую дэталь. Загадчык культпропу райкому КП(б)Б **т. Шымкевіч** напярэдадні перавыбараў сельсаветаў выехаў на выбарчы ўчастак (вёску Вруські) для правядзеньня сходу беднаты (там 48 бядняцкіх гаспадарак). Сходу Шымкевіч не правёў, а пашоў на пізкі, пяварты годнасьці камуніста, жульніцкі ўчынак. Ён, седзячы ў хаце члена сельсавету, **напісаў пратакол** сходу беднаты, які не адбыўся (з дакладам, запытаньнямі і спрэчкамі) і прывёз у раён. Гэта выявілася толькі тады, калі на гэты-ж вучастак выехаў праводзіць перавыбары сельсавету **рабочы «25-тысячнік» тав. Пятроў.**

Прыліў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калгасы па раёне надзвычай малы. З боку паасобных членаў партыі дапушчаны «левыя» перагібы, якія выявіліся ў запалохваньні беднаты і сераднякоў.

Пару слоў аб рабоце спажывецкай каапэрацыі. На чале праўленьня каапэрацыі стаіць член партыі **тав. Лівертаў,** акружаны цэлай плеядай пазбаўленых выбарчых правоў, свякоў і падхалімаў. Сакратаром праўленьня каапэрацыі і асабістым сакратаром Лівертава працуе **лішэнец Ной.** Загатоўшчык — сваяк жонкі старшыні праўленьня, таксама **пішэнец Аронаў.** Загадчыкам Вецерскай каапэрацыйнай крамы — **пішэнец Хэйфец** і г. д.

Ад усіх гэтых сацыяльна-чужых элемэнтаў, якія фактычна запраўляюць каапэрацыяй, прыкрываючыся партыйнасьцю Лівертава, чакаць работы нельга. Дэфіцытныя тавары разьмяркоўваюцца не паводле клясавага прынцыпу, а трапляюць лішэнцам, гандлярам і іншым сацыяльна-чужым элемэнтам. Пытаньнем забесьпячэньня калгасьнікаў, батрацтва, беднаты, рабочых «25-тысячнікаў» каапэрацыя не займалася. Дырэктывы партыі аб забесьпячэньні вясковага настаўніцтва ігнараваліся. У сувязі з гэтым, настаўніцтва імкнулася вырвацца на работу ў другі раён. **Як правіла тавары выдаваліся па запісках.** Малюнак будзе няпоўным, калі не дадаць сюды фактаў простага шкодніцтва, якія былі ў каапэрацыі. Там **згніло 60 бочак белых грыбоў, згніло 2 тоны канаплянага семя,** якое здаў каапэрацыі калгас **«Колос».**

Раённае партакіраўніцтва аб такім стане каапэрацыі добра ведае, але ня ўжывае ніякіх мер для яе аздараўленьня.

Сакратар райкому Фахэнгаўз аказаўся ў ролі самага заядлага душыцеля самакрытыкі. Між іншым, аб фактах заціску самкрытыкі ў «Зьвязьдзе» ў свой час былі зьмешчаны матар'ялы з нарыду дзейнасьці Фахэнгаўза ў Вузьдзенскай арганізацыі. Радавыя партыйцы на сходах балюча крытыкаваць. **Рабкораў Фахэнгаўз вымывае з раёну.** Іменна такія спробы былі ў адносінах члена партыі **тав. Таганові́ча,** які піша ў «Зьвязду» і іншыя газэты. Фахэнгаўз гэтаму таварышу прапанаваў, каб ён пераехаў у другі раён, а калі т. Таганові́ч на гэта не згадзіўся, дык Фахэнгаўз узяў курс па скампрамэтаваньне т. Таганові́ча. Члена партыі, рабселькорку т. Кулікоўскую Л. у поўным сэнсе слова зацкавалі.

Работы з рабселькорамі не вядзецца ніякай. Насьпецгазэт у раёне няма. У райкоме знойдзены 32 рабселькораўскія допісы, прысланыя рэдакцыямі газэт на расьсьледваньне, а ў райвыканкоме такіх допісаў знойдзена 36. Гэтыя допісы каля году марыцца ў сталах РК і РВК.

Адносіны Фахэнгаўза да самакрытыкі лепш за ўсё характарызуюцца яго выступленьнем на апошнім райпартсходзе. У адказ на запытаньне таварыша аб заціску самакрытыкі ў раёне, Фахэнгаўз сказаў: **«Хіба-ж можна падтрымліваць і разгортваць самакрытыку, калі зараз у газэту піша кожная...** (тут Фахэнгаўз пусьціў пахабнае слоўцо)». І потым гэты крыкатвор даў пастаўную «устаноўку» партыйным масам аб разгортваньні самакрытыкі: «Калі ты добры камуніст, бачыш хібы і думаеш пісаць, то зайдзі да мяне і ўзгадні. Мы на масы выправім недахопы і ня трэба будзе дарэмна займацца пісаніной».

Мы ўжо вышэй паказвалі на моманты скарыстаньня Фахэнгаўзам свайго службовага становішча. Але ў гэтых адносінах нельга не зазначыць на факт нікавалай ганебнасьці. Захапіў Фахэнгаўз сваю жонку (камуністку) прыстроіць на работу ў мястэчку. Прыстроілася пасада старшыні местачковага савету. Але там працаваў даволі аўтарытэтны таварыш. Для таго, каб аслабаніць пасаду старшыні местачковага савету, Фахэнгаўз напрасіў тав. Булесава і ягонага таварыша, каб тыя пацісьнулі на старшыню местачковага савету для таго, каб ён падаў заяву аб адмаўленьні ад работы. Гэта было зроблена. Фахэнгаўз мэты дасягнуў. Але Фахэнгаўзам аказалася такім «добрым работнікам», што ў даных перавыбарах яе на радзе вучасткаў з трэскам правалілі.

Кіраўніцтва Чарэйскай партарганізацыі павінна быць неадкладна здарофпена. Апартуністы, галавацяпы, крутаверы і блыгвенкі павінны быць зваразжа зьняты з работы і прыцягнуты да суровай адказнасьці. Мы спадзяемся, што цэнтральныя партыйныя органы зараз-жа зойдуцца справай аздараўленьня партыйнай арганізацыі Чарэйскага раёну.

А. Пракопаіч.

У АБОЗЕ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ТРЭЦЯГА ГОДУ

КІРАЎНІЦТВА РЭЧЫЦКІХ ФАБРЫК ПРАРЫВЫ НЯ ТУРБУЮЦЬ

Сырэц для фанэрнага заводу—на другім беразе Дняпра. Галавацяпы чакаюць, пакуль сырэц паплыве

ВЫКІНУЦЬ АБЛОМАВЫХ І АПАРТУНІСТАЎ

Фабрыкі **«Дняпро»** і **«Х Кастрычнік»** (Рэчыца) увайшлі ў трэці год пяцігодкі з вялікім прарывам. Фабрыка «Дняпро» выканала праграму ўдарнага кварталу на 69,5 проц., «Х. Кастрычнік»—на 88,04 проц. Заданьне па прадукцыйнасьці працы выканана ўсяго толькі на 86-87 проц. Затое сабекошт замест зьніжэньня даў **павялічэньне**—па «Дняпро» на 21,1 проц., па «Х Кастрычніку»—на 11,2%.

З 26-га сьнежня фабрыка працуе з перабоямі. Тэхнічныя астаноўкі ў паасобных цэхах дасягаюць **3-х гадзін.** Нядаўна фабрыка «Дняпро» амаль зусім не працавала цэлыя суткі, выканаўшы менш 1 проц. заданьня.

Першая пяцідневка студзеня дала невыкананьне: па «Дняпро» 42.67 проц. праграмы, па «Х Кастрычніку» — на 16-17 проц.

Ня лічачы асноўных прычын кепскай работы—няўвязкі паміж цэхамі, няправільнае скарыстаньне рабочай сілы і інш., прарыў выклікан таксама недахватам асіны. А калі, у сувязі з гэтым, на фабрыкі прыехалі прадстаўнікі Лесбелу, яны, крыху пагаладаўшыся, **знайшлі на тэрыторыі фабрыкі 1.050 куб. мэтраў асіны, АБ ЯКІХ КІРАЎНІЦТВА ФАБРЫК НЯ ВЕДАЛА.**

Ня менш абураючым зьяўляецца другі факт галавацяпства, які датычыць фанэрнага заводу (часткі таго-ж камбінату). Завод зараз знаходзіцца пад пагрозай спыненьня таму, што заводакіраўніцтва не паклапацілася забясьпечыць завод сырцом. Галоўныя запасы сырцу, патрэбныя заводу, знаходзяцца на левым беразе ракі Дняпро. Саматас для падняцьця калод наверх, набудова якога ўвалоцілася ў план работ 1930 г., **застаўся нязкончаным.** Цяпер для перавозкі калод патрэбна шмат коняй і яшчэ больш часу. Калі зрушыцца лёд—**ЗНАЧНАЯ ЧАСТКА СЫРЦУ ПАПЛЫВЕ.** Завод заастанецца бяз сырцу.

Новае імпартнае абсталяваньне, атрыманае ў вераснёі, паводле пляну, павінна было быць пушчана ў ход у канцы сьнежня. Але абсталяваньне да гэтага часу яшчэ не скарыстоўваецца. **Гэта выклікала выкананьне вытворчай праграмы заводу за першую пяцідневку на 79 проц.**

Гэтымі днямі заводакіраўніцтва атрымала загад адпраўіць нарады кацёл на адзін з новых лесазаводаў. Не абмеркаваўшы гэтага пытаньня, заводакіраўніцтва прапанавала зьняць кацёл. А калі гэта ўжо было зроблена, выявілася, што з гэтай прычыны нагорнылася работа фанэрнага заводу і **дзесяткі тысяч пістоў фанэры папсавеліся.** Толькі тады пачалі шукаць вінаватага і паставілі пытаньне—ці можна было ня зьнімаць кацёл. **Чатыры нарады** былі скліканы на гэтым пытаньні, **ТРЫ ТЫДНІ** прастаяў кацёл на дварэ фабрыкі. У выніку на абодвух прадпрыемствах былі страты з-за галавацяпства заводакіраўніцтва.

А дасьліна з пускам альтэрнатару, які павінен даць электраэнэргію абедзьвюм фабрыкам і фанэрнаму заводу? А марудная пабудова толькі «Кобліца» да новага катла? Хіба ўсе гэтыя факты не гавораць аб тым, што на прадпрыемстве ня ўсё добра.

Аднак, малюнак быў-бы няпоўным, калі абысьці моўчкі ігнараваньне рабочых прапаноў. За ўдарны квартал было ўхвалена 46 рабочых прапаноў з 98-мі, ажыцьцёўлена толькі 26. Прапанова рацыяналізатара Зубрыцкага—не сячы на дровы вузкія калоды асіны, а скарыстоўваць іх на доньні—не праводзіцца ў жыцьцё вось ужо больш 3-х тыдняў, у той час, калі гэта **не патрабуе ніякіх выдаткаў і дае эканоміі да 25.000 руб. у год.** Для дастаўкі тырсы ў качагарку з лесазаводу імя Томскага пабудавана чыгуначная лінія. Ня гледзячы на тое, што гэту-ж лінію можна скарыстаць для дастаўкі торфу, лінія закідана сьнегам і не скарыстоўваецца. Палянь дэфіцытныя дровы і плацяць грошы за падвозку іх.

І, нарэшце,—апартуністычная практыка ў пытаньні вытворчай праграмы 1931 году, якая **паменшана** на 18.000 скрынь. Мела месца таксама боязь абмеркаваць прамфінплян на сходах рабочых і ва ўдарных брыгадах. Прамфінплян складзен у кабінэце. Рацыяналізатарскія мерапрыемствы, якія ўваходзяць у новы прамфінплян, таксама сярод рабочых не абмеркаваны.

Ва ўсім гэтым у значнай частцы вінаваты і **фабрычныя партыйныя, прафсыянальныя арганізацыі,** асьліва, цэхавыя арганізацыі, якія не мабілізуюць рабочай масы на барацьбу з прарывамі і выкананьне прамфінпляну. Вельмі слаба кіруюць фабрычныя арганізацыі ўдарнымі брыгадамі, яшчэ горш пастаўлена барацьба з ляжэўдарнікамі. Ёсьць прыклад, калі «ўдарніца» Чарняк, якая крала нумары па выпрацоўцы, засталася арганізатарам групы і вядзе падпіску на газэты.

Чым іншым, як не слабым кіраўніцтвам трэба тлумачыць рост браку супроць пляну за асобны квартал (па «Дняпро» у 4½ разы, па «Х Кастрычніку» ў 2 разы, па фанэрным заводзе у 2½ разы) і прагулаў, якія за асобны квартал складаюць **2.498 гадзін.**

Далей такое становішча цярпець нельга. Агульна-фабрычныя і цэхавыя арганізацыі павінны сапраўды навярнуцца тварам да вытворчасьці і разам з усім рабочым калектывам дабіцца рашучага пералому, зьмятаючы са шляху абломавых і апартуністаў. З-ці год пяцігодкі павінен даць 100 проц. выкананьне сустрэчнага прамфінпляну, высунутага рабочымі.

Н. РЭЗЬНІКАЎ.

***

Малюнак становішча Рэчыцкіх запаславых фабрык дапаўняе ў сваёй карэспандэнцыі тав. К. Ф. Аказавецка, што на фабрыцы «Х Кастрычнік» **прамфінплян да рабочых не даведзен.** Рабочыя майстэрні, машына-кацельная аддзяленьня прамфінпляну **зусім ня маюць.** Заводакіраўніцтва тлумачыць гэта тым, што «няма чаго даводзіць».

„УЗАКОНЕНЫ" ПРАРЫЎ

Урокі права-апартуністычнай практыкі ў мінулым нічаму не навучылі пяперашняе кіраўніцтва **Шклоўскай паперовай фабрыкі «Спартак».** Прарыў у выкананьні прамфінпляну як-бы «узаконен», да яго адносяцца даволі спакойна, выяжджаючы на тым, што кіраўніцтва новае і не пасьпела азнаёміцца з работай.

Ударны квартал закончан з вялікім прарывам у 17 проц. Замест зьніжэньня сабекошту, ёсьць **павялічэньне** яго, ёсьць таксама павялічэньне браку.

Чаму гэта? Таму, што, па-першае, амаль адсутнічае сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Існуюць толькі тры ўдарныя брыгады з 50 чалавек, у той час, калі на фабрыцы 600 чалавек. Прагулы набылі паражаючы размах—100 чалавека-дзён у месяц. Ёсьць выпадкі рваньства.

А партыйна-прафсаюзныя арганізацыі аслабілі ўвагу да вытворчасьці, яны яшчэ не перабудавалі сваёй работы.

Агляд вытворчасьці быў праваляны, арганізаваныя брыгады паваг не пачалі працаваць. Вытворчая эстафэта, высунутая калектывам камсамольцаў, ня была падхоплена своячасова і ня была накіравана на ліквідацыю прарыву.

Насьпецгазэта ў радзе заметак выкрыла многія прычыны, якія тармозяць выкананьне прамфінпляну. Заводакіраўніцтва і фабком на заметкі не рэагуюць, а некаторыя вінаватыя ў недахопах рэагуюць ня так, як трэба. Тлумачыцца гэта тым, што **самакрытыка на фабрыцы яшчэ не разгорнута,** рабочыя ня хочуць пісаць у насьпецгазэту, кажучы: «усё роўна, нічога ня будзе».

Бюро парткалектыву не завастрае гэтых пытаньняў. Райпрафбюро і райком КП(б)Б таксама не

У ЛЕНІНСКІЯ ДНІ ВЫШЭЙ НОВУЮ ХВАЛЮ КАЛГАСНАГА ПРЫБОЮ

Слова перадавікам калгаснай будоўлі

САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ ВОПЫТ ЛЕПШЫХ КАЛЕКТЫВАЎ І ЎДАРНІКАЎ ПЕРАДАЦЬ УСЯМУ КАЛГАСНАМУ РУХУ

Рабочыя-калгасьнікі—тав. Молатаву

Стойкаму бальшавіку, паплечніку і вучню Леніна, старшыні СНК СССР—тав. Молатаву гарачае прывітаньне ад 1-га ўсебеларускага зьлёту «25-тысячнікаў».

Дарагі тав. Молатаў! Мы з вялікім здавальненьнем ухвалеем пастанову ЦВК СССР аб прызначэньні цябе старшынёю Савету Народных Камісараў Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Мы ўпэўнены, што пад тваім кіраўніцтвам, ажыцьцяўляючы лінію партыі па пастановах XVI зьезду УсеКП(б) і пленумаў ленінскага ЦК УсеКП(б), СНК павядзе самае рашучае змаганьне з правымі і «левымі» апартуністамі і двурушнікамі, з карэньнем вырве рэшткі капіталістычных элемэнтаў у горадзе і вёсцы і павядзе краіну Саветаў да хутчэйшай пабудовы сацыялізму.

Ва ўсёй тваёй рабоце мы, рабочыя добраахвотнікі фронту сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, будзем табе сталай і цьвёрдай апорай.

Няхай жыве УсеКП(б)!

Няхай жыве СНК СССР і яго кіраўнік—стойкі бальшавік т. МОЛАТАЎ.

ЦК УсеКП(б), т. Сталіну і ЦК КП(б)Б

Першы ўсебеларускі зьлёт «25-тысячнікаў», які сабраўся ўпадагульненьня вынікаў гадавой працы па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі і абмеркаваньня практычных задач па падрыхтоўцы і правядзеньні надыходзячай веснавой пасеўнай кампаніі, шле сваё пралетарскае прывітаньне ЦК УсеКП(б)Б, тав. Сталіну і ЦК КП(б)Б.

Год таму назад, у адказ на заклік нашай партыі, мы добраахвотна пайшлі ад варштатаў сацыялістычных фабрык і заводаў у розныя кутні БССР на барацьбу за сацыялістычную перабудову сельскай гаспадаркі. Мы з энтузіязмам пайшлі на работу туды, дзе асабліва моцным было супраціўленьне кулацтва ўсім мерапрыемствам партыі і савецкай улады, мы пайшлі, каб дабіцца канчатковай перамогі над нашымі клясавымі ворагамі на вёсцы і для ўзмацненьня пралетарскага кіраўніцтва калгасным рухам, батрацтвам, бядняцка-серадняцкімі масамі сялянства.

Усямерна перадаючы вопыт сацыялістычнай арганізацыі працы з сацыялістычнай прамысловасьці масам калгасьнікаў, мы ўкараняем мэтады сацпаборніцтва, ударніцтва і актыўнай работы выстворчых нарад у калгасах.

Посьпехі, дасягнутыя пралетарыятам пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі ў галіне індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі Савецкага Саюзу, поўнасьцю абвяргаюць усе прароцтвы правых апартуністаў аб непасільнасьці тэмпаў нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Гэта таксама моцна б'е па усіх «левых» і двурушніках, якія таксама зьяўляюцца рупарам клясавага ворага.

Посьпехі, дасягнутыя намі ў справе кіраўніцтва калгасамі, яшчэ раз даводзяць усю агідную нікчэмнасьць прароцтваў правых апартуністаў, працаваючых кулацкую хлусьню аб тым, што рабочыя фабрык і заводаў, незнаёмыя з сельскай гаспадаркай, ня справяцца з працай у калгасах.

Мы абяцаем Цэнтральнаму Камітэту камуністычнай партыі, што і ў далейшай сваёй рабоце ўсямерна будзем змагацца за выкананьне праграмы калектывізацыі, за выкананьне плянаў трэцяга рашаючага году пяцігодкі, які будзе годам завяршэньня фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР і БССР.

Мы нашай работай забясьпечым новы ўздым выстворчых сіл у сельскай гаспадарцы і мацнейшы зрух у справе разьвіцьця сацыялістычнай рэканструкцыі і пэшырэньня тэхнічных культур у калгасах.

На аснове правільнай ленінскай палітыкі нашай партыі, на аснове ажыцьцяўленьня суцэльнай калектывізацыі мы будзем змагацца за пасьпяховае вырашэньне рабочай клясай задачы ліквідацыі кулацтва, як клясы.

Мабілізацыяй калгасных мас у перавыбарах калгасных сыстэмы вакол задач пасьпяховага выкананьня другой бальшавіцкай вясны, мы нанясём моцны ўдар усім ворагам Савецкага Саюзу, усім шкоднікам, нац.-дэмакратам і інтэрвэнтам і яшчэ больш узмоцнім работу па правядзеньні ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Няхай жыве ЦК УсеКП(б) і непахісны яго правадыр тав. Сталін!

Няхай жыве ЦК КП(б)Б!

Няхай жыве поўная перамога сацыялізму ў Савецкай краіне і ва ўсім сьвеце!

Пастанова ЦК КП(б)Б

па дакладах Жлобінскага, Гарадоцкага, Горацкага, Віцебскага, Рэчыцкага, Полацкага і Сіроцінскага РК КП(б)Б аб ходзе ільназагатовак

Заслухаўшы інфармацыю Жлобінскага, Гарадоцкага, Горэцкага, Полацкага, Віцебскага, Рэчыцкага і Сіроцінскага РК КП(б)Б аб ходзе ільназагатовак, сакратарыят ЦК КП(б)Б адзначае, што ня гледзячы на ясныя дырэктывы, якія былі з боку ЦК аб мабілізацыі ўвагі партарганізацый на выкананьне ільназагатовак, ход загатовак праходзіць зусім нездавальняюча, а адзнаканьне ільназагатовак, ход загатовак праходзіць зусім нездавальняюча, а адзначаныя раёны адстаюць ад агульных тэмпаў ільназагатовак.

Адночасова сакратарыят ЦК падкрэсьлівае нерашучую і невыстарчальную ўзьдзейнасьць з боку вышэй памянёных арганізацый на кулацкія і заможныя гаспадаркі ў справе выкананьня імі цьвёрдых заданьняў па ільназагатоўках, у выніку чаго кулацкія і заможныя гаспадаркі выканалі даныя ім цьвёрдыя заданьні на 15-34 проц.

Выходячы з гэтага, сакратарыят ЦК КП(б)Б, пастанаўляе:

1. За нездавальняючае праведзеньне кампаніі па ільназагатоўках, невыстарчальнае, нерашучае рэагаваньне на поўнае выкананьне кулацкімі і заможнымі гаспадаркамі цьвёрдых заданьняў—ЖЛОБІНСКАМУ, ГОРАЦКАМУ, ПОЛАЦКАМУ, ВІЦЕБСКАМУ, РЭЧЫЦКАМУ І СІРОЦІНСКАМУ РК КП(б)Б—АБВЯСЦІЦЬ ВЫМОВУ.

2. Прапанаваць РК КП(б)Б правесьці рад дадатковых мерапрыемстваў на падставе дырэктыў ЦК, каб дабіцца сапраўды рашучага пералому ў ільназагатоўках, у асаблівасьці ільназалакна, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на поўнае выкананьне цьвёрдых заданьняў кулацкімі і заможнымі гаспадаркамі.

3. Пастанову апублікаваць у друку.

Вырасьлі ў 26 разоў

УДАРНЫЯ ТЭМПЫ КАЛГАСУ ІМЯ 1-га МАЯ

Калгас імя 1-га Мая зьляецца адным з буйнейшых у Спуцкім раёне. Гэты калгас арганізаваўся ў 1925 г. з 9 сямей яўрэйскай местачковай беднаты, на плошчы 66 гэкт. і за мінулы год ператварыўся ў буйную калектыўную гаспадарку, якая зараз аб'ядноае 236 сямей на плошчы 1.500 гэкт.

Такое пашырэньне калгасу за год забясьпечана было бальшавіцкай работай мясцовых партыйных і савецкіх органаў. Партыйная ячэйка калгасу і гарсавет правялі вялікую работу па мабілізацыі актыўнасьці местачковай беднаты і вакольных бядняцка-серадняцкіх мас сялянства на сацыялістычную перабудову сельскай гаспадаркі.

У справе гаспадарчага замацаваньня калгасу, калі ён павялічыўся больш чым у 26 разоў па колькасьці сямей і ў 23 разы па плошчы, перад кіраўніцтвам калгасу паўстала складаная і адказная задача па правільнай арганізацыі працы, расстаноўцы на ўсе вучасткі рабочай сілы і найбольш рацыянальнага яе скарыстаньня. Усе пытаньні, зьвязаныя з арганізацыяй працы ў калгасе, былі ўсебакова абмеркаваны на выстворчых нарадах і сходах калгасьнікаў. Поле калгасу намі падзелена на 7 вучасткаў, на якіх пастаянна працавалі пэўныя брыгады з колькасьцю людзей адпаведна характару работы і яе аб'ему на тым ці іншым вучастку. Уведзена 4-х разрадная тарыфная сетка. Вопыт паказвае, што найбольш удалай і патрэбнай зьяўляецца зьдзельная праца ў калгасе.

Пераважная колькасьць калгасьнікаў працуе сапраўднымі ўдарнымі тэмпамі. Ва ўмовах нашага калгасу, у якім значнае месца займае гароднініцтва, жывёлагадоўля, разьвіцьцё малочнае выстворчасьці, вялікае значэньне набывае ўжываньне жаночае працы. Раней даводзілася сустракацца з такімі зьявішчамі, калі частка жанчын адмаўлялася працаваць, заяўляючы: «муж на мяне заробіць». Такія адсталыя настрої падтрымоўваліся і некаторай часткай мужчын. Гэта пытаньне абмяркоўвалася на радзе сходаў жанчын і калгасьнікаў, у выніку чаго мы маем пералом у справе паляпшэньня працы жанчын у калгасе. Найбольш актыўна з жанчын-калгасьніц паказвае сябе на рабоце моладзь. Шмат лепшых ударніц вызначана для прэміяваньня. Найбольш актыўная на працы ў калгасе камсамолка Хведаровіч Марыля намі была камандыравана дэлегаткай ад калгасу ў Маскву для ўдзелу ў правядзеньні «Тыдню Савецкай Беларусі».

Калгас імя 1-га Мая з посьпехам вытрымаў экзамен першага выстворчага году і з вялікімі дасягненьнямі ўступіў ў трэці рашаючы год пяцігодкі. Ураджай яравых культур калгасу значна вышэйшы, чым у адзіноасобным сэктары. Зьнят з 30 гэкт. вялікі ўраджай гароднініны. У калгасе да 500 галоў рагатае жывёлы і 96 сьвінаматак.

Значных посьпехаў мы дасягнулі ў справе будаўніцтва. За мінулы год пабудавалі новы скоты двор на 125 галоў, сьвінарнік на 100 штук, памяшканьні для складу гароднініны, квасільны пункт і сіласную вежу. Перавыкананы плянавае заданьне па сіласаваньні. Усіх гэтых вынікаў мы дасягнулі дзякуючы вялікай актыўнасьці калгасных мас у выкананьні задач партыі па калектывізацыі сельскае гаспадаркі і неаслабнаму кіраўніцтву работай калгасу з боку вясковай партарганізацыі.

Зараз складзен выстворчы плян другой бальшавіцкай вясны. Плян прапрацаваны на выстворчай нарадзе і на гэтых днёх будзе абмеркаваны ва ўсіх выстворчых зьвеньнях калгасу.

Для правядзеньня веснавой пасеўнай кампаніі калгас у выстарчальнай меры забясьпечан цягавай сілай: у калгасе ёсьць два трактары і 100 рабочых коняй. Зараз рамантуецца сельска-гаспадарч інвэнтар, збруя і павозкі.

Паводле пляну, сёлета будзе засаджана каля 30 гэкт. плошчы фруктовымі дрэвамі. Стада буйнай рагатай жывёлы

Дэлегаты слухаюць даклад т. Міцькова.

даводзіцца да 1.000 штук. Паставім на адкорм 300 сьвіней.

Пасьля абмеркаваньня на сходзе ячэйкі кытаньня аб веснавой пасеўнай кампаніі, вылучаны са складу калгасьнікаў ударныя брыгады для работы ў вёсцы па ўцягненьні ў калгасы адзіноасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Мы ўпэўнены, што з выкананьнем задач веснавой пасеўнай кампаніі наш калгас справіцца з посьпехам.

Работніца Бабруйскага фанэрнага заводу нам. старшыні праўленьня калгасу ХЭЙСІНА.

Калгас „Забайкал“

ПАКАЗАЎ ПЕРАВАГУ КАЛЕКТЫЎНАЙ ГАСПАДАРКІ

КАЛ», Коханаўскага раёну,—адзін са старэйшых калгасаў. Яна арганізавалася яшчэ ў 1919 г. Сярод калгасьнікаў большасьць батракоў, рэшта—беднякі і сераднякі.

З-за адсутнасьці кіраўніцтва з боку мясцовых арганізацый, у калгасе раней панавала поўная бясплянавасьць і безгаспадарчасьць. У мінулым годзе падкулачнікі, якія пралезьлі ў калгас, зьнішчылі 100 авец. У калгасе было ўкрадзена 150 пудоў аўса, зьнікла б. памешчыцкая вага.

Усе гэтыя факты былі мною выкрыты па прыезьдзе ў калгас, а матар'ялы аб іх перададзены сьледчым органам.

З дапамогай актыву ўдалося зьнішчыць бясплянавасьць у рабоце. У мэтах правільнай расстаноўкі сіл арганізаваны брыгады па розных галінах сельскай гаспадаркі. Выпадкі парушэньня працоўнай дысцыпліны і нявыхад на работу пасьля арганізацыі брыгад значна зьменшыліся.

Раней у калгасе існавала пераважна падзённая аплата працы і толькі часткова практыкавалася зьдзельная. У 1930 г. быў узят курс на перавод работ толькі на зьдзельную аплату. Першыя спробы далі самыя станоўчыя вынікі. Так, пры падзённай аплаце калгасьнік у сярэднім атрымліваў 90 кап.—1 руб. у дзень, а пры зьдзельнай ён выробляе 1 р. 30 к.—1 р. 40 к. Значна павялічыўся эканамічны эфэкт работы.

Характэрны факт. Да 1929 г. калгасьнікі-мужчыны атрымлівалі па 1 руб. у дзень, а жанчыны—80 кап. У 1930 годзе становішча зьмянілася—некаторыя калгасьніцы, працуючы па ўдарнаму, атрымліваюць значна больш, чым мужчыны. У работу ўцягнуты ўсе жанчыны. Жаночая праца выкарыстоўваецца асабліва ў часе ўборачнай кампаніі.

Для выкарыстаньня гаспадарчага вопыту серадняку, адзін з іх быў высунут на пасаду загадчыка гаспадаркай і цёлкам сябе апраўдаў. Узаемаадносіны паміж сераднякамі і іншымі членамі калгасу добрыя.

У часе веснавой пасеўнай кампаніі 1930 году калгасьнікі «Забайкалу» практычна дапамаглі арганізаванаму імі новаму калгасу імя 1 мая.

Забайкальцам прышлося вытрымаць вялікую барацьбу з кулацтвам, якое актыўнымі выступленьнямі і пагрозамі прабавала сарваць калгаснае будаўніцтва і пасьпяховае правядзеньне веснавой кампаніі. У гэтай барацьбе калгасьнікі, пры дапамозе райкому партыі, перамаглі і скончылі свой гаспадарчы год з посьпехам.

У выніку растлумачальнай работы ўдалося завербаваць у партыю 5 батракоў-калгасьнікаў. Асаблівую дапамогу ў рабоце калгасу аказаў райком партыі ў асобе сакратара яго т. НОВІКАВА, які прыехаў у калгас і дапамог наладзіць усю работу. З боку-ж райкалгасаюзу ніякага падтрыманьня калгас ня меў.

«Забайкал» паставіў сабе мэтай у бліжэйшы-ж час уцягнуць у калгас лепшых беднякоў і серанякоў вёскі Перавалочна. Гэта тым больш магчыма, што калгас за мінулы гаспадарчы год паказаў усю перавагу калектыўнага вядзеньня гаспадаркі над індывідуальным. На вёсцы створана ініцыятыўная група, якая паступова разгортвае сваю работу.

Калгас распачаў падрыхтоўку да другой бальшавіцкай вясны. Цягавай сілай ён забясьпечан на ўсе 100 проц. Ёсьць 20 коняй. Дрэнная становішча з кармамі. У 1929 годзе было засеяна 18 гэктараў канюшыны, але яна на 90 проц. вымерзла і згінула. Для ліквідацыі прарыву ў кармох калгасьнікі правялі рад мерапрыемстваў. Пабудавана сіласная яма, пад кармавыя буракі засеялі 3 гэктары. Ня гледзячы на труднасьці, калгас усё-ж спадзяецца выйсьці з цяжкага становішча з кармамі.

Інвэнтар амаль цалкам у спраўнасьці і не патрабуе рамонту. Калгас атрымаў новыя плугі і бораны. Пачалася ссыпка насеньня. Абмалот канюшыны затрымліваецца з-за няспраўнасьці малатарні, дзе паломана шасьцярня. Калгас 15 раз зьвяртаўся ў Белсельснаб за дапамогай, але да гэтага часу не атрымаў адказу.

Выстворчы плян на 1931 г. складзен і абмяркоўваўся на агульным сходзе калгасьнікаў.

Калгасьнікі ўпэўнены, што пры падтрыманьні партыйнай арганізацыі яны з посьпехам правядуць другую бальшавіцкую вясну.

ЗАСЬЦЕНЧЫК.

«25-тысячнік»—рабочы менскага дражджавога заводу «Чырвоная зорка».

Правільная расстаноўка

ЛЮДЗЕЙ І МАШЫН

забясьпечыць посьпех другой бальшавіцкай вясны

Даклад тав. Рачыцкага па першым усебеларускім зьлёце «25-тысячнікаў» выклікаў гарачыя спрэчкі, якія занялі вячэрняе пасяджэньне 14 студзеня і ранішняе пасяджэньне 15-га студзеня.

У спрэчках выказалася звыш 40 таварышоў.

Тав. Маскалік (Шклоўскі раён), Пракоп'еў (Асьвейскі раён), Новікаў (Гомельскі раён), Куран, Захаровіч (Чуховіцкі раён) і іншыя таварышы адзначылі, што тэмпы падрыхтоўкі да веснавой сяўбы ў большасьці раёнаў невыстарчальныя. У многіх раёнах (Сураскі, Гарадоцкі) пляны веснавой кампаніі ўсё яшчэ абгаварваюцца ў габінэтах і не даведзены да калгаснай масы.

— Трэба зьвярнуць сур'ёзную ўвагу, кажа тав. Пракоп'еў (Асьвейскі раён), на складаньне выстворчых плянаў. У мінулым годзе пляны складаліся бясплянава і гэта адбілася на ўсёй рабоце калгасаў. На жаль, і ў гэтым годзе па некаторых раёнах з плянамі вышла блытаніна. Так, Асьвейскаму раёну НКЗемам быў даўдзен плян сяўбы яравога кліну на плошчы ў 14 тыс. гэкт. Праз некалькі дзён даведзена тэлеграма аб павялічэньні пляну да 21 тыс.

НКЗем вельмі мала ўвагі зьвяртае на падрыхтоўку кадраў да веснавой пасеўнай кампаніі. Праз спэцыяльныя курсы намячалася прапусьціць калі 100 тыс. калгасьнікаў. Але на сёньняшні дзень пляны падрыхтоўкі не даведзены да раёнаў і нічога ня робіцца для кваліфікацыі калгасьнікаў і падрыхтоўкі патрэбных кадраў.

Тав. Масканік (Шклоўскі раён) адзначае, што праўленьне райкалгассаюзу нельга выцягнуць з раёну ў калгас. Праўленцы прыцыпова лічаць немагчымым наведваць калгасы.

Т. Карабанаў адзначае, што машыны паміж калгасамі разьмяркоўваюцца бясплянава. Адзін калгас атрымлівае некалькі машын, часта яму непатрэбных, а другі — ніводнае. Ніхто ня сочыць за правільным выкарыстоўваньнем машын. У мінулым годзе машыны былі нагружаны ня больш, як на 25 проц. Складаная малатарня працавала па 6 дзён у месяц пры 6-гадзінным рабочым дні, у той час, калі калгасы не маглі абмалаціць збожжа з-за адсутнасьці рабочых рук.

Тав. Протчанка (Уваравіцкі раён) указвае на няправільнае выкарыстоўваньне трактараў. Трактар працуе дзень на адным месцы — потым яго перакідваюць за 10 вёрст у іншае месца з тым, каб праз два-тры дні зноў перакінуць яго на ранейшае месца.

Трактары стаяць некалькі месяцаў бяз руху, — адзначае т. Малкіна, — выключна з-за адсутнасьці пязначных запасных частак. Раённыя арганізацыі ня ўжылі належных мер да арганізацыі своечасовага рамонту машын і трактараў.

Большасьць дэлегатаў зьлёту зьвярнула таксама ўвагу на слабы ход будаўніцтва ў калгасах. Пляны будаўніцтва мяняюцца райкалгассаюзамі па некалькі раз. Леспрамгасы не адпускаюць лесаматар'ялаў.

Калгас «Батрак», Гомельскага раёну, атрымаў заданьне пабудаваць сьвінарнікі і дзялянкі. З вялікімі труднасьцямі калгасу ўдалося наладзіць дастаўку і вывазку лесаматар'ялаў. Калі ўсё было падрыхтавана да пачатку будаўніцтва, райкалгассаюз даў загад аб спыненьні будаўніцтва ў сувязі са зьменай напрамку калгасу.

Выступаўшыя дэлегаты адзначалі слабую работу кааперацыі, якая ўсё яшчэ не павярнулася тварам да калгасаў. Грамадзкае харчаваньне калгасьнікаў у большасьці раёнаў зрываецца з-за неныстарчальнай увагі з боку спажывецкіх таварыстваў.

Зусім ня зьвернута ўвага на правільнае скарыстаньне млыноў у калгасах. Ніхто ня ціканіцца гэтым пытаньнем. Калі ў млыне псуецца якая-небудзь дробная частка, ён ужо спыняе сваю работу. Млыны знаходзяцца ў бясхрытульным становішчы. Калі калгасы зарачаюцца ў райвыканком, апошні накіроўвае ў Саюзхлеб, Саюзхлеб у райвыканком і так без канца. У выніку — большасьць млыноў у радзе райнаў стаіць.

У спрэчках выступіў таксама старшыня Белкалгасцэнтру т. Міцькоў, які адзначыў вялізарныя посьпехі «25-тысячнікаў» за год іх працы ў калгасах.

На ранішнім пасяджэньні з заключным словам выступіў Наркамзем т. Рачыцкі.

З дакладам аб сувязі «25-тысячнікаў» з прадпрыемствамі і ўстановамі і аб далейшых задачах работы ў гэтай галіне выступіў член прэзыдыуму ЦСПСВ т. Плешакоў.

Зьдзельшчына і скарыстаньне гаспадарчага вопыту серадняка

БЯЗЬЛІТАСНА БІЦЬ ПА ПРАВА-„ЛЯВАЦКАЙ“ ПРАКТЫЦЫ

Гадавы вопыт работы «25-тысячнікаў» у вёсцы паказаў, што пасланыя з горада рабочыя на кіруючую працу па калектывізацыі сельскай гаспадаркі, поўнасьцю апраўдалі сябе, унесьлі багаты арганізацыйна-выстворчы вопыт у калгаснае будаўніцтва.

Асноўная ўмова посьпеху працы рабочага - калгасьніка — падтрыманьне і належная дапамога ў рабоце з боку мясцовых партыйных і савецкіх арганізацый. Вось гэтых асноўных умоў для работы «25-тысячніка» ня было ў калгасе «Дружба», Уваравіцкага раёну. Гэты калгас існуе з 1922 г. і зьяўляецца адзіным у сельсавеце. Інтэнсыўная гаспадарка з плошчай 182 гэктары, маючы садова-гародны і жывёлагадоўчы ўхіл, пры наяўнасьці толькі 36 працаздольных членаў, патрабуе правільнай расстаноўкі рабочай сілы, рацыянальнае скарыстаньня, забясьпячэньня цьвёрдай працыцэдзяньні, сьвядомых адносін кожнага калгасьніка да сваіх абавязкаў. У гэтым напрамку і была накіравана мая дзейнасьць як старшыні праўленьня калгасу — рабочага «25-тысячніка».

Вопыт зьдзельшчыны цалкам сябе апраўдаў, аб чым гаворыць практыка работы доек.

Дзякуючы зьдзельшчыне мы атрымалі магчымасьць скараціць колькасьць доек і перавялі іх на іншыя галіны работы ў гаспадарцы.

З мэтай стварэньня спрыяючых умоў для работы калгасьніц, з мэтай укараненьня жаночай працы ў калгасе арганізаваны яслі.

Паколькі арцель існуе ўжо больш 8-мі год, уся жывёла калгасьнікаў абагулена. Калгасьнікі забясьпечваюцца хлебам, малаком і тлушчамі па кааперацыйных цэнах, а ўсімі іншымі харчамі і камунальным абслугоўваньнем калгасьнікі карыстаюцца бясплатна. Такім чынам, выдаткі калгасьнікаў на харчы зусім нязначныя і рэальны прыбытак даволі высокі. Напрыклад, у сям'і калгасьніка Іваньковскага 5 членаў, а іх 4 працаздольныя. Даход сям'і ў месяц складае 140 руб. Выдаткі-ж гэтай сям'і на харчы і прамысловыя тавары ў месяц складаюць толькі 28 руб. Гэты прыклад не адзінкавы. Ён сьведчыць аб добрай матар'яльнай забясьпечанасьці членаў арцелі «Дружба».

Калгасьнікі задаволены сваім становішчам і добрасумленна адносяцца да работы. Стымулам для павышэньня прадукцыйнасьці працы ў калгасе зьявілася ўвядзеньне сацпаборніцтва, хаця гэты мэтад працы яшчэ не заняў у калгасе належнага месца. Найбольшым недахопам у рабоце калгасу зьяўляецца зусім слабае праўленьне арганізуючай ролі ў справе ўцягненьня арцель новых бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Калгас «Дружба» за 8-гадовы час свайго існаваньня ня меў росту. І заразі, калі наглядаецца вялікі ўздым калгаснага руху бядняцка-серадняцкіх мас сялянства, калгас пашыраецца за лік новых гаспадарак вельмі павольна. Прычына такога становішча заключаецца ў тым, што парт'ячэйка калгасу ня ставіла перад сабой мэты пашырэньня калгасу за лік новых бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Кіраўніцтва ячэйкі фактычна праводзіла ўвесь час апартуністычную практыку. Палова членаў ячэйкі да гэтага часу не зьяўляюцца калгасьнікамі. За мінулы год зьмеены 3 сакратары ячэйкі, але аруку ў рабоце доўгі час не заўважалася.

У сваіх мерапрыемствах па ўзьняцьці працоўнай дысцыпліны я ня меў падтрыманьня з боку ячэйкі. У адказ на заўвагі аб прагулах з боку пасобных камуністаў і на мерапрыемствы па стварэньні лепшых умоў для працы жанчын - калгасьніц з боку былога сакратара ячэйкі Цімаховіча былі праўлены процідзеяньні. Да рэчы, сам Цімаховіч да часу майго прыезду ў калгас за два месяцы меў толькі 4 працадні ў калгасе. На прапанову аб неабходнасьці фізычна працаваць усім камуністам Цімаховіч вынуждзіў патрабаваньне неадкладна вярнуць яму пай, бо ён ня хоча заставацца далей у калгасе.

Райком замест таго, каб узьдзейнічаць на сакратара ячэйкі і патрабаваць ад яго работы ў калгасе, санкцыянаваў капрызы Цімаховіча аб выхадзе. На заўвагу аб тым, што вярнуць пай Цімаховічу, паводле статутных правіл, зараз нельга, былы сакратар Уваравіцкага РК, т. Шпак дакорліва папракнуў: «Ты сам, калі лічыцца з законнымі палажэньнямі, няправільна выбраны старшынёю праўленьня, таму што «25-тысячнікі» ня члены калгасаў» і нарэшце, дадаў: «выкопвай, што табе загадваюць і больш нічога».

Новы сакратар ячэйкі калгасу Пазьнякоў не забясьпечыў пераломy ў рабоце. Апартуністычная практыка з боку кіраўніцтва ячэйкі працягвалася. Больш таго, Пазьнякоў задаўся мэтай выжыць з калгасу рабочага «25-тысячніка», старанна вышукваючы прычыны для гэтага. Пазьнякоў бачыць «дзейнічаць». Без санкцыі ячэйкі склікае сход беднаты і ставіць пытаньне аб выключэньні з калгасу радзі серадняку, як кулацкіх элемэнтаў. На справе-ж ніякіх кулацкіх элемэнтаў у калгасе ня было. Былі сераднякі Сеіч, Сачоў і Кірманаў, якія ў мінулым мелі ня больш як на 3-5 гэкт. зямлі на гаспадарку, а год прабылі ў калгасе, добрасумленна адносячыся да работы. Вось гэтых асоб і аднаго былога чырвонаармейца (за тое, што ён жанаты на дачы Соіча) сакратар ячэйкі хацеў штучна зрабіць кулакамі, а мне, як старшыні праўленьня «прышыць» сувязь з кулакамі і на гэтай падставе зьняць з пасады старшыні праўленьня.

Беднята-калгасьнікі не згадзіліся з ідэяй «левага» загібшчыка Пазьнякова, але яго ўчынак унёс вялікую дэзарганізацыю ў работу калгасу. Пасьля такога ўчынку серадняцкая частка калгасьнікаў ня выйшла на работу. Пазьнякоў настаноўкай нытаньня аб выключэньні з калгасу серадняку груба парушыў дырэктывы партыі аб скарыстаньні гаспадарчага вопыту серадняка ў калгасе і прыцягненьня яго да кіруючай работы.

На здымках зьверху справа налева: дваццаціпяцітысячнікі т. т. Шэвеленка, Матыльская, Іванова, Маніна.

Аб «лявацкім» наскоку Пазьнякова было своечасова паведамлена райкому. Але рашучых захадаў у адносінах да «левага» загібшчыка РК ня ўжыў. Пасылаліся камісіі, пісаліся вынікі, а канкрэтнага нічога ня было ўжыта. Толькі калі справа дайшла да ЦКК, быў зьняты з работы Пазьнякоў і абвяшчэньнем яму суровай вымовы з папярэджаньнем, а некаторыя апартуністы былі выключаны з партыі.

Ня лепшыя адносіны да задач сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, у прыватнасьці да кіраўніцтва работай калгасу «Дружба», былі і з боку сельсавету. Па сутнасьці сельсавет (стары склад) стаяў у баку ад калектывізацыі і гэту работу ня пічыў сваёй галоўнай задачай. Толькі раз за ўвесь год быў заслухан на пленуме сельсавету даклад аб стане калгасу «Дружба» і задачах арганізацыі новага прыпляву ў калгасы. Прычым сельсавет нічога не зрабіў для практычнага ажыцьцяўленьня прынятай па гэтым пытаньні пастановы.

Толькі пасьля аздараўленьня парт'ячэйкі і перавыбараў саветаў вызначыўся пералом у рабоце па калектывізацыі. З гэтай задачай увязваецца справаздачна-перавыбарчая кампанія калгасу і падрыхтоўчая работа да веснавой пасеўнай кампаніі. Праведзена справаздача калгасу па 5-ці вакольных населеных пунктах, створаны ініцыятыўныя групы па калектывізацыі. Поўным ходам разгорнута ў калгасе падрыхтоўчая работа да другой бальшавіцкай вясны. Калгас мае адзін трактар і ўсе неабходныя с.-г. машыны. Зараз адбываецца рамонт гэтых машын. Праведзен абмен конскіх коняй на працаздольных. Зараз увесь конскі склад калгасу ў добрым стане.

Паводле вытворчага пляну, сёлета, замест 10 гэктараў у мінулым годзе, вызначаецца пад гароднініну 50 гэктараў. Усё насеньне для гароднініны і іншых тэхнічных культур загатоўлена. Зроблены цеплякі, падрыхтавана глеба для парнікоў, загатоўлены рамы і іншае абсталяваньне. Гарод у большай частцы будзе засаджан кораньплодамі для насоньня (буракі, морква, капуста і інш.). Парнікі падрыхтаваны для насадкі памідораў.

Сёлета ў значнай меры ў калгасе павялічваецца стада прадукцыйнай жывёлы. Плошча калгасу за лік запаснога фонду пашыраецца на 150 гэктараў.

Ва ўсёй рабоце па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы нам неабходна пашырыць у калгасе сацыялістычныя мэтады працы, пераводзячы яе на рэйкі ўдарніцтва. Парт'ячэйка і сельсавет павінны разгарнуць масавую работу па калектывізацыі. Асноўная задача калгасу «Дружба» — арганізаваць новы калгасны прыбой, павесьці шырокую работу сярод адзіноасобнікаў — беднякоў і сераднякоў за ўступленьне ў калгас, шляхам паказу перавагі калектыўнай гаспадаркі перад дробнай адзіноасобнай.

РАБОЧЫ «ПАЛЕСДРУКУ»,
СТАРЫНЬНЯ ПРАЎЛЕНЬНЯ
КАЛГАСУ «ДРУЖБА»
ГАНЧАРОЎ.

Па Савецкай Беларусі

Перавыбары нацсаветаў

Вышэй клясавую баяздольнасьць нацсаветаў

8-га студзеня пад старшынствам тав. **Вансоўскага** адбылося пасяджэньне пре выдыуму нацкамісіі ЦВК БССР. На гэтым пасяджэньні былі заслуханы справаздачы брыгадзіраў, якія, згодна пастановы ЦК КП(б)Б, выяжджалі ў раёны на перавыбары нацыянальных саветаў.

Брыгадзіры падзяліліся вельмі цікавым матар'ялам з месц, матар'ялямі, які ілюструе клясавую барацьбу вакол перавыбарчай кампаніі, рост актыўнасьці выбаршчыкаў, а таксама патрэбы нацыянальных меншасьцяў і сельскіх саветаў.

Наогул перавыбары нацыянальных саветаў праходзілі пад знакам росту актыўнасьці выбаршчыкаў новага прыліву ў калгасы (напрыклад, у Аляксандраўскім польскім сельсавеце ў часе кампаніі стварыліся два буйныя калгасы).

Значна вырас прадант наведваньня перавыбарчых сходаў, у параўнаньні з мінулым годам. Асабліва гэта відаць з наведваньня сходаў жанчынамі. Так, калі летась у **Бярозаўскім нямецкім** сельсавеце з 362 жанчын на сход зьявілася 9-10, дык у гэтым годзе мы маем там-жа **52 проц.** жанчын на сходзе. У **Верацейскім** літоўскім сельсавеце ў мінулым годзе прымала ўдзел у сходах **50 проц.** жанчын, сёлета-ж— **55 проц.**

Клясавы вораг — кулак часьцей за ўсё праз сваіх агентаў падкулачнікаў ва многіх месцах імкнуўся супрацьпаставіць кандыдатурам парт'ячэек і сходаў беднаты свае кандыдатуры.

У **Аляксандраўскім сельсавеце (Беларніччына) у Высаўцох** прадстаўнік каталіцкіх клерыкалаў выступіў з прамовай супроць сакратара партыйнае ячэйкі, імкнучыся скампраметаваць апошняга. Яму далі адпор усім сходам.

У **Верацейскім** сельсавеце — расказваў тав. **Юдышас** — кулакі таксама імкнуліся скарыстаць у сваіх мэтах адсталую частку беднаты, агітуючы яе вуснамі за ўласных кандыдатаў. У сяле **Бабінавічах** надта актыўна «працавуў» ксёндз; партыйна - камсамольская арганізацыя ня здолела мабілізаваць масы бядняцтва і серадняцтва на барацьбу з клерыкалізмам. У пераважнай большасьці выпадкаў спробы кулацтва цярпелі поўную няўдачу.

Далёка ня ўсюды раённыя кіруючыя арганізацыі правялі, як належыць, падрыхтоўчую работу да перавыбараў нацыянальных саветаў. Характэрна, што **Натанаўскі** сельсавет (Віцебчына) за адзін год атрымаў 1.500 паперак з РВК, але наўрад ці бачыў два разы «жывога» прадстаўніка райвыканкому па сваёй тэрыторыі.

У **Бярозаўскім** сельсавеце (Параўлянчына) позвы рассылаліся «мёртвым душам»; у калёніі **Антонаўка** позвы атрымалі 6 нябожчыкаў. 4 гады таму назад памёр 14-гадовы хланец і вось сёлета, калі наводзе меркаваньняў галавацяпаў з камісіі садзейнасьці, ён дасягнуў поўных гадоў.

— Калі ласка, позвачку! Сваячасова зьявецеся...

Брыгадзіры заўважылі таксама і слабую пастаноўку іменна нацыянальнай работы у сельсаветах.

Пераважная большасьць нашых нацыянальных сельсаветаў не праводзіць цалкам сваю работу на мове тэй нацменшасьці, якую яна абслугоўвае. **Бешанковіцкі, Чашніцкі** яўрэйскія месцачковыя саветы, **Маковіцкі - польскі, Унаўскі - латыскі** сельсаветы—усе яны працуюць на беларускай і на расійскай мове.

Такому становішчу спрыяюць часам начулыя адносіны раённых установ. Так, напрыклад, былы старшыня **Бешанковіцкага** РВК у свой час загадаў:

— Пратаколаў пасяджэньняў і сходаў на яўрэйскай мове ў райвыканком не дасылаць!

Нацыянальныя саветы, якія паўна пацьвярджаюць самім існаваньнем правільнасьць вырашэньня партыйнай праблем нацыянальнай палітыкі, патрабуюць максымальнай увагі і падтрыманьня. Нацкамісіі ЦВК трэба ўлічыць гэта ў сваёй штодзённай рабоце. Партыйныя-ж арганізацыі на месцах павінны ўзяць нацсаветы пад сваё планавае і пастаяннае кіраўніцтва.

Юр. Л—ны.

Яўрэйскую беднату—у сацыялістычнае будаўніцтва

(Артыкул старшыні ЦВК СССР і УССР т. **Г. І. Пятроўскага**)

Замяжупараздаваньне дзесяткаў тысяч яўрэйскай беднаты, уцягненьне яўрэйскай бядняцкай моладзі ў дзяючую прамысловасьць, дзе да Кастрычніцкай рэвалюцыі і яўрэі налічваліся адзінкамі, сацыялістычнае будаўніцтва ў Біробіджане—раёне яўрэйскага зямляпараздаваньня на Далёкім Усходзе, посьпехі калектывізацыі яўрэйскіх пасёлкаў у Крыме,—усё гэта дасягненьні ленінскай нацыянальнай палітыкі, работы партыі і савецкай улады сярод яўрэйскіх працоўных мас.

Усесаюзнае таварыства АЗЕТ, арганізацыя, якая яднае ў сваіх радах сотні тысяч працоўных розных нацыянальнасьцяй, заклікана садзейнічаць рэканструкцыі сацыяльнай структуры яўрэйскага насельніцтва.

Дзейнасьць АЗЕТ'у зьяўляецца адначасова базай для інтэрнацыянальнага выхаваньня шырокіх мас працоўных, бараньбы з антысэмітызмам, нацыяналізмам і шавінізмам.

У мястэчках Украіны, Беларусі і Заходняй вобласьці ёсьць яшчэ яўрэйская дэклясаваная беднота, якая з прычыны спецыфічных умоў свайго мінулага,—калі царызм гвалтам не дапускаў яе да зямляробчай і прамысловай працы,—яшчэ ня ўцягнута ў сацыялістычную будоўлю СССР.

Дапамагчы партыі і савецкай уладзе ператварыць гэтыя бязьдзейныя рукі ў рукі будаўнікоў сацыялізму—задача АЗЕТ'у.

Для ўмацаваньня сваёй фінансавай базы і разгортваньня работы, якая праводзіцца АЗЕТ'ам, зараз рэалізуецца 3-я Усесаюзная АЗЕТ-лётарэя.

У гэтай кампаніі 3-й АЗЕТ-лётарэі павінны прыняць удзел ня толькі члены АЗЕТ, але ўсе працоўныя, рабочыя і калгасьніі ўсіх нацыянальнасьцяй.

Рэалізацыя выпушчаных АЗЕТ'ам 6.000.000 білетаў дасьць з мільёны рублёў на зямляпараздаваньне і ўцягненьне ў вытворчасьць яўрэйскай беднаты ў Крыме, Біра-Біджане, на Украіне і інш. абласьцях нашага Саюзу.

Фабрычна-заводскія камітэты, мясцкомы, кооперацыя, школы, ВНУ і інш. грамадзкія арганізацыі павінны ўжыць рашучыя меры для поўнай рэалізацыі білетаў АЗЕТ-лётарэі.

У той час, калі становішча яўрэйскіх мас у панскай Польшчы і баярскай Румыніі ўсё пагаршаецца, а ў Палестыне пад ярмом ангельскага імпэрыялізму абвяргаецца арабска-яўрэйская разьня,—становішча яўрэйскіх мас у СССР усё больш паляпшаецца, яны ўсё больш уцягваюцца ў сацыялістычнае будаўніцтва.

Пашыраючы і купляючы білеты АЗЕТ-лётарэі, мы ўзмацняем сацыялістычнае будаўніцтва, умацоўваем інтэрнацыянальную салідарнасьць працоўных, б'ем па капіталістычным Захадзе, дзе яўрэйскія працоўныя нацыянальна і сацыяльна прыгнечаны.

Ні аднаго працоўнага бяз білету АЗЕТ-лётарэі!

За ўцягненьне яўрэйскай беднаты ў сацыялістычнае будаўніцтва!

За ленінскую нацыянальную палітыку!

Антысерадняцкія загібы ў загатоўках

(Ад нашага карэспандэнта)

Зборскі сельсавет (Асіпавіцкі раён) дапусьціў рад грубейшых памылак і скрыўленьняў клясавай лініі ў загатоўках. Замест растлумачальнай работы сярод беднаты і серадняко̆ў—адзіпаасоб нікаў аб палітычнай важнасьці загатовак, замест мабілізацыі батрацка-бядняцкіх мас вакол кампаніі. Зборскі сельсавет пайшоў па лініі найменшага супраціўленьня і праводзіў загатоўкі шляхам адміністраваньня. Сельсавет вызначыў цьвёрдыя заданьні па загатоўках бульбы, сена, саломы, ільнаваланка і інш. маламоцным серадняцкім гаспадаркам. У адней в. Вязьве цьвёрдыя заданьні даны васьмі сераднякам, сярод якіх пяць сем'яў чырвонаармейцаў і актыўных удзельнікаў грамадзянскай вайны. Гаспадаркі гэтых сялян ня маюць ніякіх адзнак заможных гаспадарак.

Такая практыка была амаль у кожнай вёсцы Зборскага сельсавету. Між тым, у сельсавеце ёсьць сапраўдныя кулакі, якія распрадалі сваю маемасьць і прыкідваюцца «беднякамі» (кулак Вярнікоўскі, в. Камарына і інш.).

Актыўным правадніком «лявацкіх» перагібаў зьяўляецца брыгадзір Асіпавіцкага РВК **Шырокі.** Ён-жа ў сьнежні мінулага году на агульным сходзе сялян в. Зборск абзываў беднякоў «быдлам» за тое, што яны не хацелі галасаваць за абкладаньне ў індывідуальным парадку серадняка Сабела. Шырокі ўсё-ж абклаў гэтага серадняка, і Асіпавіцкаму РВК прыйшлося потым гэту памылку выправіць.

Вельмі дзіўна, чаму РВК да гэтага часу ня прыцягнае Шырокага да адказнасьці за яўнае парушэньне дырэктыў партыі і пастаноў ураду.

Т.

КУЛАЦКА-АНТЫСЭМІЦКАЕ ГНЯЗДО НА ПАБУДОВЕ ПУЦІ ЖЛОБІН—МАГІЛЕЎ

(Ад нашага рагачоўскага карэспандэнта)

На вучастку пабудовы 2-га пуці чыгункі Жлобін — Магілеў зьявіла сабе гняздо хэўра антысэмітаў, кулакоў, «лішэнцаў», былых людзей, вычышчаных з савецкага апарату. На пабудове працуюць дзесятнікамі б. член «союза русского народа»—правакатар РАБАЎ і б. жандар АРЦЕМЕНКА. Рахункаводам працуе б. член «союза русского народа» ВАДЗІЛА, вычышчаны ў 1921 годзе з савецкага апарату і выключаны з прафсэюзу.

На вучастку пануе абураючая безгаспадарчасьць: лесаматар'ялы даставляюцца за сотні вёрст з Калугі, а ЛЕСАЗАВОД ІМЯ ХАЛТУРЫНА, які знаходзіцца на адлегласьці ¼ вярсты ад месца работ, наіроўвае лесаматар'ялы ў Калугу. Гэтыя сустрэчныя перавозкі значна ўдаражаюць будаўніцтва і загружаюць транспарт.

Працадысцыпліна на пабудове ў заняпадзе, аб ударніцтве і сацпаборніцтве нават і ня чуваць. Культработа сярод рабочых не вядзецца, самакрытыка не разгорнута. Ахова працы ў агідным становішчы.

Нядаўна на вучастку мела месца выпадка антысэміта-дзесятніка ЯКУБОВІЧА, які сьпіхнуў рабочага-яўрэя ЗБАРОЎСКАГА з цягніка, крыкнуўшы: «ідзі, пяшком жыдоўская морда, а то пад цягнік падкіну, з жыдамі сацыялізму не пабудуеш».

РКК-РСІ, заслухаўшы даклад брыгады, якая абсьледавала будаўніцтва, кваліфікавала гэты выпадак, як контррэвалюцыйную вылазку, пад маскай антысэмітызму. ЯКУБОВІЧ ЗЬНЯТ З РАБОТЫ. СПРАВА АБ АГІДНЫХ НЕПАРАДКАХ І БЕЗГАСПАДАРЧАСЬЦІ ПЕРАДАНА ПРАКУРАТУРЫ. ПРЫНЯТЫ МЕРЫ ДЛЯ АЧЫСТКІ ВУЧАСТКУ АД АНТЫСАВЕЦКІХ ЭЛЕМЭНТАЎ.

Г. МЭЙЦІН.

Апэрацыйная зводка

Падрыхтуемся да Ўсесаюзнай нарады па пытаньнях рабселькораўскага руху

Выклік віцебскіх рабселькораў прынят

Культпропам Менскага гаркому партыі, сумесна з рэдакцыямі цэнтральных газэт, 9-га студзеня была скліканая нарада рабкораў, рэдкалегій шматтыражак і насьпенгазэт з удзелам сакратароў партыйных ячэек, старшынь фабзаўмасцкомаў і дырэктароў прадпрыемстваў, прысьвечаная падрыхтоўцы да ўсесаюзнай нарады па пытаньнях рабселькораўскага руху.

Была заслуханы даклады намоцніка заг. Культпропу ЦК КП(б)Б т. Курціка аб задачах рабкораў у 3-м годзе пяцігодкі і т. Каждана аб удзеле нізавога друку ў справаздачна - перавыбарчай кампаніі гарсавету. Нарада заслухала інфармацыю аб ходзе падрыхтоўкі да ўсесаюзнай нарады рэдактароў шматтыражак наступных прадпрыемстваў Менску: заводаў «Энэргія», «Камунар», «Бальшавік» і фабрыкі «Кастрычнік».

Выступіўшыя ў спрэчках па справаздачы сакратар гаркому тав. Кавальчук, загадчык Культпропам тав. Пятушкоў і іншыя таварышы адзначалі неыстарчальнасьць разгортваньня работы па падрыхтоўцы да ўсесаюзнай нарады, слабасьць кіраўніцтва гэтай справай з боку партыйных ячэек і недастатковы ўдзел рабкораў, заводскага друку ў справаздачна - перавыбарчай кампаніі гарсавету.

Прадстаўнік ЦО «Правды» т. Ушаранка адзначыў у сваім выступленьні мэты, якія ставіць перад сабой усесаюзная нарада па пытаньнях рабселькораўскага руху.

Нарада пастанавіла правесьці праверку работы рэдкалегій шматтыражных і насьпенных газэт над кутом погляду падрыхтаванасьці да 3-га году пяцігодкі, увязаўшы гэта з падрыхтоўкай да ўсесаюзнай нарады.

Прынят выклік рабкораў на лепшую падрыхтоўку да ўсесаюзнай нарады і даручана ўсім цэнтральным газэтам штодзённа даваць зводку аб ходзе падрыхтоўкі на прадпрыемствах, да якіх яны прымацаваны.

Пастаноўлена арганізаваць усебеларускую радыё-пераклічку шматтыражак на лепшую падрыхтоўку да ўсесаюзнай нарады.

Шматтыражкам і насьпенгазэтам прапанавана адвесьці спэцыяльныя куткі ходу перавыбарчай кампаніі.

Нарада падкрэсьліла, **«што справа падрыхтоўкі да ўсесаюзнай нарады па пытаньнях рабселькораўскага руху павінна стаяць на высокім палітычным узроўні і павінна зьявіцца справай усёй партыйнай арганізацыі ў цэлым».**

С. П—і.

„Камінтэрн" уключыўся

Шэйная фабрыка **«Камінтэрн»** уключылася ў падрыхтоўку да ўсесаюзнай нарады па пытаньнях рабселькораўскага руху.

Арганізавана 7 брыгад для самаправеркі работы.

У кожную з іх уцягнута 30 рабкораў і ўдарнікаў. На першай інструкцыйнай нарадзе прысутнічала больш 200 рабкораў і ўдарнікаў, якія добраахвотна заявілі аб сваёй згодзе прымаць актыўны ўдзел у самаправерцы ўсёй работы рэдкалегіі.

У чырвоным кутку фабрыкі арганізаваны куток ходу праверкі.

РАСІН.

Слухайце, слухайце!

Рэдакцыя «Правды» сумесна з палітсакратарыятам цэнтральнага радыёвяшчаньня арганізуюць **17 студзеня праз станцыю УсеЦСПС усесаюзную радыё-пераклічку рабселькораў СССР, прысьвечаную падрыхтоўцы да ўсесаюзнай нарады па пытаньнях рабселькораўскага руху.**

З уступным словам выступіць прадстаўнік «Правды».

Ля мікрафону рабселькоры Масквы, Ленінграда, Харкава, Растова, Сьвярдлоўску, Менску, і іншых гарадоў.

Перакліч пачнецца роўна ў 7½ гадзін вечара і будзе трансьлявацца праз Менскую радыё-тэлефонную станцыю.

Рэдкалегіі, рабкоры, селькоры, ваенкоры, арганізуйце калектыўнае слуханьне перакліч!

***

Культпропам Менскага Гаркому КП(б)Б сумесна з рэдакцыяй газэты **«Рабселькор»** арганізаваны налёт на прадпрыемствы і ўстановы з мэтай высьвятленьня як яны ўключыліся ў падрыхтоўку да ўсесаюзнай нарады па пытаньнях рабселькораўскага руху.

Вынікі налёту будуць надрукаваны на старонках «Рабселькора».

Падрыхтуем кадры газэтных работнікаў

Культпроп ЦК КП(б)Б зьвярнуўся да ўсіх гаркомаў і райкомаў КП(б)Б з дырэктыўным лістом аб наборы ў Камуністычны Інстытут Журналістыкі на 1931-32 навучальны год.

Палепшае палітычнае друку і павышэньне яго ролі ў разгортваньні сацыялістычнага наступленьня патрабуюць асаблівай увагі партарганізацый да падрыхтоўкі кадраў газэтных работнікаў.

Згодна пастановы ПК УсеКП(б) ад 11 лістапада 930 г. да канца пяцігодкі, на ўсіх раёнах будуць створаны самастойныя друкаваныя газэты. У сувязі з гэтым патрабнасьць у кадрах газэтных работнікаў будзе ўсё больш узрастаць. Гаркомы і райкомы КП(б)Б, разам з рэдакцыямі гарадзкіх раённых газэт, павінны выбраць і накіраваць лепшых рабселькораў - ударнікаў (членаў КП(б)Б) на вузоўку ў Камуністычны Інстытут Журналістыкі, які рыхтуе сярэдняе зьвяно работнікаў центральных, рэспубліканскіх, краявых і абласных газэт, а таксама рэдактароў буйных раённых і гарадзкіх газэт.

Гаркомы і райкомы КП(б)Б павінны забясьпечыць поўнае выкананьне наступнай арыентовачнай разьвёрсткі месц у КІЖ на 1931-32 навучальны год: **Менскі гарком КП(б)Б**—5 чал., **Віцебскі**—4, **Гомельскі**—4, **Аршанскі** райком КП(б)Б—3, **Полацкі**—2, **Магілеўскі**—2, **Рэчыцкі**—2, **Барысаўскі**—2, **Жлобінскі**—2, **Клімавіцкі**—2, **Мазырскі**—1, **Слуцкі**—1, **Бабруйскі**—2.

У дадатак да правілаў прыёму ў КІЖ растлумачваецца, што для рабочых са значным вытворчым стажам дапушчальна зьніжэньне партыйнага стажу да 3-х год, пры ўмове адпаведнасьці кандыдатуры ўсім іншым запатрабаваньням.

Адбор кандыдатаў і дасылка ўсіх дакумантаў у Культпроп ЦК КП(б)Б павінна быць скончана не пазьней 25-га студзеня г. г.

Могуць рэкамендаваць кандыдатуры і райкомы КП(б)Б, якім па разьверстцы месцы ня вызначаны.

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ на ЛЮТЫ і далейшыя м-цы 1931 г.

на газ. **„ЗЬВЯЗДА"**

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА на 1 месяц—1 руб.

З 1-І—31 г. газэта **ВЫХОДЗІЦЬ БЕСЬПЕРАПЫННА**

Падпіска прымаецца ўсюды на пошце.

Калгасы перавыканалі плян збожжазагатовак

Адстае індывідуальны сэктар

Замест практычных мерапрыемстваў па фарсаваньні збожжазагатовак, многія раённыя арганізацыі сядзяць, склаўшы рукі і спадзяюцца на самацёк. У выніку другая пяціднеўка студзеня ня толькі не дала ніякага зруху ў збожжазагатоўках, а наадварот паказала зьніжэньне тэмпаў супроць першай пяціднеўкі студзеня. Калі за першую пяціднеўку месячны плян быў выканан на 4,4 проц., дык за другую пяціднеўку плян выканан на 3,1 проц. Па індывідуальным сэктары плян выканан ўсяго на 2,5 проц. супроць 4,6 проц. у першую пяціднеўку.

ГАДАВЫ ПЛЯН ЗАГАТОВАК У СЯРЭДНІМ ПА БССР НА 10 СТУДЗЕНЯ ВЫКАНАН УСЯГО НА 78,2 ПРОЦ. КАЛГАСЫ ВЫКАНАЛІ ГАДАВЫ ПЛЯН ПА 114,2 ПРОЦ., ІНДЫВІДУАЛЬНЫ СЭКТАР—НА 82 ПРОЦ., САЎГАСЫ—НА 35,1 ПРОЦ.

СЬПІС

Дакладчыкаў, вылучаных Менгаркомам КП(б)Б для правядзеньня дакладаў аб ленінскіх днях:

Чмелеўскі, Гурыновіч, Лабараў, Гаеўскі—чыгунка, Рамізевіч—«Полымя рэвалюцыі», Гурэвіч (ЦКК), Сапун (ЦК)—«Энэргія», Стракоўскі, Гантман, Кумаков — «Бальшавік». Ракаў, Галанзя — Ударнік», Рыўлін, Югаў, Сікерская—абутковая ф-ка, Гутман (Калгасцэнтр), Модэль—шпотачная ф-ка, Цэнцынер—пічаціная ф-ка, Агульнік — «Камунар», Фрыдман—зав. «Д. А.», Будзін—«Пралетары», Лынькоў —«Беларусь», Курцік—«Камунарка», Лупец—«Кастрычнік», Любін—«Беларуска», Тамашэвіч—скарняжная ф-ка, Красіна—шпаленная ф-ка, Шчацько-Тэкстыльшч., Гольдштэйн—хлебазавод, Хацкевіч — Эльвод, Шындлер—«Уціль», Кумкес—школа краўпоў, Слонім — друкарня імя Сталіна Онэраў — «Беларуска», Тапхілевіч — Менбуд, Гольдберг — ф-ка рымароў, Альперовіч—Буд. адд., МЦРК, Савіч—«Чырвоная ворка», Мінц—малочны завод, Талачоў—хладобойня, Верба—абутков. майст. Галаскок—сьпіртавод, Гімельфарб і Сьпіцько—калбасн. ф., Усьпенскі, Раготнэр—хэмфармзавод, Лойко, Рудзіцкі—шкіязавод, Казючыц—«Чырвоны Хэмік», Крываносаў—ф-ка імя Крупскай, Шаліма—УМГ, Жылінскі—грузчыкі, Валасевіч—лямцавая ф-ка, Герцман—Палата мер і вагі. Круцялёў, Майзэль Ю., Майзэль Я.—Белсамрамсаюз, Розін—Гаржылсаюз, Яцкевіч — Аўтагіраўніцтва. Абрамсон—Каап. прад. харчав., Флеер Мёталовыя МЦРК, Кондраль, Хаськін, Зелянонак, Гурыновіч, Канакоцін.

Усім сэкр. яч. дазарыцца з дакладчыкамі аб месцы і часе дакладаў.

Усім вылучаным т. т. неабходна зьявіцца ў Дом Камасьветы. 16-1-31 г. у 7 гадз. веч. (пакой № 19) на кансультацыю.

Паведамленьні

— **Партколегія ЦКК КП(б)Б** уносіць наступныя зьмены па выкліках аналючых на ПТ ЦКК УсеКП(б).

Акрамя выкліканых раней т. т. на 16, 17, 18, 19, 20 студзеня а 10 гадз. раніцы **выкліканюцца наступныя т. т.** у зьмену раней абвешчаных ім тэрмінаў:

НА 16-1-1931 г. Кулеш Г. Ф., Масэвіч В. А., Давыдаў П. Р., Сабіла С. М., Цяўлоўскі К. І., Эпштэйн М. Н., Белы А., Фэйгельман Я. Л., Кантаровіч С. З., Панасевіч Ул. Л., Гарэлін Б. М., Сурэмкін Н. М., Гурскі А. Я., Татарыцкі П. А., Гітлін З. Х.

НА 17-1 31 г. Эльянаў С. О., Лапіцкі С. Н., Сідарэнка П. І., Федарэнчык Я. С., Сташэўскі К. Н., Цузаневіч. Ул. І., Шыраў А. Н., Магідаў А. С., Гранчык Р. А., Давідовіч Д. Я., Кузавец П. А., Радкевіч І. С., Вераб'ёў Т. Я., Маркін Б. С., Русіновіч П. У.

НА 18-1 31 г. Буракоў М. У., Сьняжноў А. А., Бараша П. С., Цырлін Л. А., Навіцкі А. П., Федасеяў І. А., Шэйман І. Ш., Гярашчанка І. М., Шэйман І. У., Дворкін Я. М., Робан А. А., Галкін Е. Ф., Сьпевак М. А., Малева М. М., Костка Я. У.

НА 19-1 31 г. Дубнэль Д. А., Корба С. Р., Герасімаў М. М., Раўнейка П. С., Бабіч Ф. Дз., Астапенка П. А., Гурло Ўль Е., Беларусаў Д. І., Ананевіч Р. К., Гольдзін М. Я., Баркоўскі Ўл. А., Суворaў М. М., Рэпкавец С. В., Грычэнка Я. Ц.

НА 20-1 31 г. Грыбоўскі П. Х., Паўпаў П. Дз. ,Корсан М. І., Бірлін Б. М., Даніленка Я. І., Герасіменка Л. Д., Мінкоў Ю. З., Брушкоў А. Р., Кохан А. А., Вялеска У. А., Юрэвіч У. Я., Красноў П. М., Сідзельнік А. Р., Чупракоў П. Л., Куцікаў М. Л., Дзэмчанка І. Г., Ермакоў І. П., Золатанбка.

Усе выдаткі—за асабісты кошт апэлюючых.

—Для дапамогі у правядзеньні перавыбарчай кампаніі гарсавету, Менскі гарком КП(б)Б мабілізуе на 4 дні нижэйпаказаных таварышоў:

Будзінскі—рэд. «Зьвязда», Дунец—«Акцябр», Красіна—«Рабочы», Курцік—ЦК, Кучынскі—«Сав. Белар.», Шастакоў—«Савец. Белар.», Фрыдман—СНК., Некрашэвіч—БДВ., Саевіч—Камвуз, Тамашэвіч — Камвуз, Агульнік—ВАН, Шчарбакоў—БАН, Яцкевіч—Дартранс, Розін—Наркамгандаір, Шчэлько—Дзяржстрах, Верба—ЦКК, Лынькоў — Белдзяржыд., Альперовіч — Дзяржплян, Шындлер—Дзяржплян, Хаськін—БКС, Залічонак—БКС, Філаметаў—ЦРК, Танхілевіч—ЦК, Канакоцін—ЦК, Лабадаеў—ЦК, Рыўлін—ЦК, Югаў—Гістпарт, Жолудаў—ЦКК, Герцман—ЦКК, Аверын—ЦКК, Галаскок—Камунбанк, Каранеўскі—БДУ, Усьпенскі—Пэдфак, Ракаў—Саўбуд, Кананцін—Саўбуд, Панкевіч—НКАсьветы, Гутман—Калгасцэнтр, Кірніо—Калгасцэнтр, Жылінскі—Верх. суд, Мар'ясіна—НКЮ, Балабанава—НКЮ, Залескі—НКФ, Розэнгаўз—Дзяржбанк, Буткевіч—Дзяржбанк, Сэрбэнта—Гістпарт, Маназль—Гістпарт, Мандрык—Бел. Бюро чыг., Юдэльзон—НКЮ, Лібензон—ЦК, Эфраімскі—Саюзскур., Кейлін—Саватрапе, Раготнэр—Пэдфак, Масевіч—Радыёцэнтр., Бялуга—НКАсьвет.

Менск, друкарня «ЗЬВЯЗДЫ».

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Рэдакцыя і галоўная канторa Менск, Савецкая, 63.

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	13-80	Начны рэдактар	6-12
Сакратар	10-74	Галоўная канторa	7-31
Сэктар інфармацыі	6-19	Аддзел падпіскі	7-31
		„ абвестак	7-81

Умовы падпіскі (з дармовым дадаткам „Прафрух")

На 1 мес.	1 р.
„ 3 мес.	3 „
„ 6 мес.	6 „
„ 12 мес.	12 „

Падпіска прымаецца ўсюды на пошце.

Плата за абвесткі:

За радок ноль пасьля тэксту—50 к., іншы гарадзкія абвесткі—1 р. за радок. Пасьлядоўнае тэксту—у два разы дарожэй. Пры пратэрміновым друкаваньні—скідка. Зьвыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бяруцца 10 проц. падатку.

Абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газэты „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая 63, 2-гі паверх, тэл. 7-81.

Згубленыя і украдзеныя дакумэнты

лічыць несапраўднымі

Чл. біл. с. гарб. Урачынскага Э., 3620; квіт. № 7425 кр. МЦРК № 48 Пятухоўскага Я., 3621; пашп. Руда. с/с, дав. аб выб. пр. Руда. с/с Шылай А. К., 3622-3623; мэтр. вып. Сьміл. РВК Шыраў М. Г., 3624; мэтр. вып. Паперн. с/с Мельгуй З. П., 3625; мэтр. вып. Паперн. с/с Мельгуй Л. П., 3626; мэтр. вып. Паперн. с/с Мельгуй М. П., 3627; мэтр. вып. Паперн. с/с Мельгуй А. П., 3628; акл. ліст Астр.-Гар. РВК Мельгуй П. Ф., 3629; акл. ліст і пат. Мен. гарфа Варатынскага Я. О., 3630; чл. біл. № 2631 с. прапасьв. Нэрніс Э. Я., 3631; кон. кн. Мен. ваенк. Рубіна А., 3632; дав. аб пр. БДВ, казп. кн. Койд. спаж. т-ва Цалкінда С. Я., 3633-3634; намс. біл. № 137271 Маг. АК ЛКСМ, чл. біл. Маг. акр. праўл. с. краўц. Дзеліпкевіча М. А., 3635-3636; мэтр. вып. Мен. ЗАГС, чл. біл. № 4664 Мен. с. палаўн. Куніцкага В. В., 3637-3638; мэтр. вып. Мен. ЗАГС Уэльпина І. С., 3639; тал. на прамтав. МЦРК Аксельрод Б. Ю., 3640; чл. біл. с. СГР Пашкова Я., 3641; пашп. Мен. мін. Одэр Ц. Б., 3642; вайск. біл. Мен. ваенк., чл. біл. с. буд., лек. кн. страхк. Ліўшыца 1. 1., 3643-3644; чл. біл. № 9926 с. СГР Берман Л. С., 3645; пашп. Мен. мін. Вульфа Л. Х., 3646; дав. аб пр. гон. Мен. мін. Шабана І. С., 3647; пасьв. ас. Хаберавай Ш. Х., 3648; лек. кн. Мен. страхк. Гаеўскага М. Ф., 3649; мэтр. вып. Мен. ЗАГС Ражковай Е. А., 3650; мэтр. вып. Мен. ЗАГС Ражковай М. А., 3651; мэтр. вып. Койд. мін. пасьв. Байд. с/с тал. на прамтав. Койд. спаж. т-ва Клімовіча А. П., 3652-3654; чл. біл. с. транс. Шварц У. А., 3655; асаб. кн. Рымкевіча Б. А., 3656; пашп. і дав. аб выб. пр. Мен. мін., пасьв. на атр. дап. Мен. саб. Малчаўскай М., 3657-3658; пашп. Мен. мін. Буш Ю. Ф., 3659; чл. біл. с. палаўн. Доўнара Б. А., 3660; чл. біл. с. МСП, пэнс. кн. чыг. страхк., каап. кн. Вузда. спаж. т-ва Шавель С. С., 3661-3663; пашп. Мен. мін. Грынцэвіч І. С., 3664; мэтр. вып. Мен. ЗАГС Асіповіча П. А., 3665; вайск. біл. Мен ваенк. Васілеўскага Я. Л., 3666; дзіц. кн. Мен. страхк. Васілеўскага Е. Я., 3667; дав. аб пр. БДВ Васілеўскага Я. Л., 3668; лек. кн. Мен. страхк. Камеклатова К. І., 3669.

Беларускі Другі Дзяржаўны тэатр
Сёньня, 16 студзеня пастаноўка для фабкому шэйнай ф-кі імя Крупскай
„ПЕРШАЯ КОННАЯ"
Пачатак у 9 гадз. веч.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР **„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"**
1. **ВОСТРАЎ БЕГЛЯКОЎ** драма ў 6 частках.
2. **Глядзі ў корань** кіно-фельетон.
3. Замежны гукавы кіно-фільм **ЧЭМПІЁНЫ ПЛАВАНЬНЯ**
Пачатак 7 г., 8 г. 45 м. і 10 г. 30 м. Каса—з 5 гадз. веч.

Кіно-тэатр **„Культура"**
Лепшы фільм сезону з эпохі грамадзянскай вайны **ТАБЕ ДАРУ** драма ў 6 разьдзелах, Кіно-хроніка **„Саюзкіно" № 64.** Пачатак у 7 г., 8 г. 40 м. і 10 г. 20 м. **Каса—з 5 гадз.**

Кіно **„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"**
Цікавы фільм паводле вядомага апавяданьня **Шолам-Алейхэма** **ЯЎРЭЙСКАЕ ШЧАСЬЦЕ** — ЗВЫШ ПРАГРАМЫ — **часопіс „Саюзкіно" № 63.** Пачатак 1-га сэансу—6 гадз. Каса—з 4 гадз. 30 м.

КІНО **„Пралетары"**
Амэрыканскі прыгодніцкі фільм **ЧОРНЫ ЦЫКЛЁН** Пачатак: 6 г., 7 г. 30 м., 9 г., 10 г. 30 м. Каса—з 4 з пал. гадз.

КІНО **„Юны Піянэр"**
Апошняя сэрыя **„ЧЫРВОНЫЯ Д'ЯВАЛЯТА"** кіно-аповесьць у 6 част. Пачатак: 1 гадз., 2 гадз. і 3 гадз. дня. Каса адкрыта з 12 г. дня.

КІНО **„ПартаК"**
Звыш праграмы гастролі арт. ленінгр. тэатраў **С. М. ВОЛЯНЫНА** — на экране — **ПАЛАЧЫ** ў 7 частках з пралёгам. Пачатак 7 г., 9, 11 гадз. **Каса—з 5 гадзін.**

Даводзіцца да ведама арганізацый і ўстаноў БССР, што **ЎСЕБЕЛАРУСКАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ** акцыянэрнага т-ва ўсесаюзнага загатоўчага аб'яднаньня камунальных гаспадарак **„ВЗОК"** **ЛІКВІДУЕЦЦА.**
Усе функцыі, што раней выконваліся „ВЗОК'ам", пераходзяць да Белдзяржснабу, да якога ў далейшым і належыць зварачацца па пытаньнях забесьпячэньня, захаваньня і выдачы запасных частак, якія ёсьць на будаўнічых матар'ялах, кабельную прадукцыю, пажарны інвэнтар, спэцодзежу і інш. будуць перададзены галоўнаму кіраўніцтву камунальнай гаспадаркі і пажарнай аховы БССР (б. НКУС) і Белдзяржснабу.
Усе прэтэнзіі павінны быць прадъўлены Ўсесаюзнаму аддзяленьню „ВЗОК" (Менск, Пляц Волі № 13) **да 1 лютага 1931 г.**, пасьля гэтага аддзяленьне прэтэнзіі прымаць ня будзе і іх належыць накіраваць у праўленьне „ВЗОК"—Масква.
„ВЗОК".

16-га студзеня 1931 г. роўна ў 6 гадз. веч. у **вялі** пасяджэньні Менгаркому КП(б)Б (Энгельса, 28, 3-ці паверх) скліканая
нарада сакратароў ячэек КП(б)Б, кіраўнікоў сэктараў росту партыі г. МЕНСКУ
з наступным парадкам дня: 1) Аб перавыбарах гарсавету. 2) Аб ходзе вярбоўкі рабочых у партыю.
Яўка абавязкова.

БЕЛІЛЬНАСАЮЗУ патрэбны для працы ў РЭСПУБЛІКАНСКІМ АПАРАЦЕ:
1 агранам - плавальнік, 1 агранам-ільнавод 1 зоатэхнік, 2 разьявных інструктары, 1 рацыяналізатар. Для працы ў раёнах: агрономы, бухгальтары і рахункаводы. Умовы аплаты па згодзе. **Зьвяртацца** па адресе: **Менск, Белільнасаюз,**